Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 МАЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 98 (28208) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Як смокінг стаў сямейным тэатрам

Сцэнарыі падарожжа на лета

Ажыўшая памяць загаворыць

СТАР. 13

ЛІЧБА ДНЯ

Br7 млн 85 тыс. 990

склала налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў у Беларусі ў красавіку 2016 года (у сакавіку бягучага года — Br7 млн 94 тыс. 521), паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у красавіку гэтага года складала Br7 млн 118 тыс. 128 (у сакавіку — Br7 млн 136 тыс. 393).

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 23°
Віцебск	+ 21°
Гомель	+ 23°
Гродна	+ 23°
Магілёў	+ 22°
Мінск	+ 22°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 26.05.2016 г.

Долар ЗША	19703,00 ▼
Еўра	21965,00 ▼
Рас. руб.	299,03 ▲
Укр. грыўня	785,29 ▼

ISSN 1990 - 763X

«ЗЯЛЁНЫЯ» ДОЙЛІДЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работнікі «зелянгаса» Кастрычніцкага раёна Мінска ствараюць кветкавую інсталяцыю з выявай Прывакзальнай плошчы сталіцы.

■ Працяг тэмы

АРАНДАТАРЫ Ў СУЧАСНАЙ КАМУНАЛЬЦЫ: САЦЫЯЛЬНАЕ ЗЛО ЦІ ДЖЫН У БУТЭЛЬЦЫ?

Чаму гаспадар не можа распараджацца жыллём па ўласным жаданні?

Недахоп грошай на асобную кватэру, падзел жылля паміж былымі сужэнцамі, жаданне зэканоміць, набываючы меншую плошчу, або наадварот — зарабіць, здаючы маёмасць у арэнду. Гэта бадай што асноўныя прычыны такой сітуацыі, калі ў краіне з'яўляецца ўсё больш камунальных кватэр, саўладальнікамі якіх часта становяцца не проста незнаёмыя, а абсалютна супрацьлеглыя па ладзе жыцця людзі. Трапіць у камуналку даволі проста, а вось эксплуатаваць яе па ўласным жаданні бывае цяжка, а часам і немагчыма, пакуль у жыллёвым заканадаўстве краіны не зменяцца правы карыстання такімі памяшканнямі.

Сёння, калі адзін з уласнікаў захоча здаць свой пакой у арэнду, ён павінен будзе атрымаць абавязковую згоду на гэта ад другога гаспадара жылля. Жыць у кватэры, прыводзіць гасцей, прадаць памяшканне (з першапачатковай прапановай саўладальніку) ты права маеш. А вось для арэнды патрэбна згода суседа па камуналцы.

СТАР. 3

■ Медыцынская практыка

НА ШТО ХВАРЭЭ... МАНЕКЕН?

Беларуская медыцынская акадэмія паслядыпломнай адукацыі, чатыры медыцынскіх ВНУ, 16 каледжаў і цэнтр павышэння кваліфікацыі будуць уключаныя да 2020 года ў так званую сімуляцыйную адукацыю. Гэта сучасны сусветны падыход да адукацыі як урачоў, так і сярэдняга медперсаналу.

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення кадравай палітыкі, установ адукацыі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Вольгі МАРШАЛКІ**, новы кірунак дапаможа, у першую чаргу, павысіць бяспеку для пацыентаў, знізіць магчымасць урачэбных памылак і ўскладненняў. Бо сёння медыкі авалодваюць тымі ж практычнымі навыкамі, галоўным чынам, каля ложка хворых. У той час як існуе магчымасць адпрацоўваць любыя маніпуляцыі, нават правядзенне родаў, з дапамогай манекенаў.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!

Падпісацца на газету можна самымі рознымі спосабамі (нават не выходзячы з дома). Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Парламенцкі дзённік

ШТРАФ ДЛЯ «ЧОРНАГА КАПАЛЬНІКА»

Згодна з законапраектам, які дэпутаты прынялі ў першым чытанні, ён складзе да 50 базавых велічынь

У краіне — больш за 2000 помнікаў археалогіі, больш за 10 000 археалагічных аб'ектаў. На думку распрацоўшчыкаў праекта закона і дэпутатаў, настаў час абараніць гэту спадчыну, што называецца, па-сапраўднаму. У суседняй Расіі для «нелегальных археолагаў» прадугледжана крымінальная адказнасць, але, на думку айчынных заканатворцаў, у нас дастаткова будзе і адміністрацыйнай.

Патлумачыць людзям

Наталля КУЧЫНСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы, у размове з журналістамі нагадала, што ў сакавіку гэтага года ў сілу ўступіў Указ Прэзідэнта, які тычыцца аховы археалагічнай спадчыны.

— Гэтым Указам вызначана: усе археалагічныя артэфакты, якія знойдзены выпадкова або не выпадкова, падлягаюць перадачы ў дзяржаўную ўласнасць, — сказала Наталля Кучынская. — Займацца археалагічнымі даследаваннямі, пошукам можа толькі прафесіянал на падставе дазволу, атрыманага ад Нацыянальнай акадэміі навук. Сёння мы працуем над развіццём гэтага Указа і прымаем законапраект, які ўносіць змены і дапаўненні ў некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях аховы археалагічных артэфактаў.

Цікава, што адміністрацыйная адказнасць за незаконны пошук і абарот археалагічных артэфактаў устанаўліваецца на заканадаўчым узроўні ў нашай краіне ўпершыню. Кампетэнцыю па складанні пратаколаў за гэтыя правапарушэнні прапануецца надаць органам унутраных спраў.

На думку дэпутата, ахова археалагічных помнікаў — вельмі цікавае пытанне.

— Яго трэба ўзнімаць на ўзроўні грамадскага абмеркавання, тлумачыць нашым людзям, што незаконная дзейнасць «чорных капальнікаў» наносіць незваротныя страты нашай з вамі спадчыне, — упэўнена Наталля Кучынская.

У якасці асноўнага пакарання за незаконную здабычу і абарот археалагічных помнікаў уводзяцца штрафы.

— У нас прапануецца адміністрацыйная адказнасць, — паведаміла парламентарый. — У гэтым ёсць сэнс, таму што наша задача — прадухіліць і палажыць канец такім з'явам. Таму ў якасці пакарання прапануюцца штрафы і канфіскацыя сродкаў, пры дапамозе якіх адбывалася незаконная здабыча археалагічных артэфактаў, а таксама канфіскацыя знойдзеных «чорным капальнікам» прадметаў. Штраф за незаконны пошук артэфактаў складзе ад 15 да 50 базавых велічынь, за незаконны абарот — 10-30 базавых.

Калі можна спілаваць дрэва?

Дэпутаты Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы прадставілі ў першым чытанні праект закона, ініцыятарамі якога сталі яны самі. Дакумент уносіць дапаўненні і змяненні ў некаторыя законы нашай дзяржавы «па пытаннях абыходжання з аб'ектамі расліннага свету».

Таццяна КАНАНЧУК, намеснік старшыні азначанай Пастаяннай камісіі, паведаміла, што праект закона распрацаваны групай дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з удзелам зацікаўленых дзяржаўных органаў.

— Неабходнасць дакумента звязана з тым, што, перш за ўсё, з 31 снежня гэтага года ўступае ў сілу новы Лясны кодэкс Рэспублікі Беларусь.

Што да практычнага аспекту, то асаблівую ўвагу дэпутаты ўдзялілі ў дакуменце азялененым тэрыторыям.

— Мы ведаем, што, згодна з Законам «Аб ахове навакольнага асяроддзя», азялененыя тэрыторыі агульнага карыстання: паркі, скверы, бульвары — падлягаюць спецыяльнай ахове, — зазначыла Таццяна Кананчук. — Законапраект прапануе такія тэрыторыі агульнага карыстання плошчай 0,1 га і болей абавязкова ўключаць у схемы азялененых тэрыторый гарадоў і адпаведна ўстанавіць пэўныя забароны, абмежаванні на аб'екты расліннага свету, што растуць на гэтых тэрыторыях.

Дакумент прапануе таксама пералік выпадкаў, калі магчыма «выдаленне дрэў, іншых аб'ектаў расліннага свету» без дазволу мясцовых улад.

— Гэта такія выпадкі, як рост раслін на сельскагаспадарчых землях, у межах зямельных участкаў, на тэрыторыях, прадастаўленых для будаўніцтва газаправодаў, нафтаправодаў, кабельных ліній электрапередачы, а таксама калі аб'екты расліннага свету знаходзяцца ў аварыйным стане, у выпадку надзвычайнай сітуацыі, — пералічыла Таццяна Кананчук.

Бяспекай грэбаваць нельга

Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў нашай краіны, прысутнічаў на ўчарашняй сесіі Палаты прадстаўнікоў. Адказваючы на пытанні журналістаў пра нядаўняе нападзенне вучня на настаўніцу, ён звярнуў увагу: такі выпадак нетыповы для нашай краіны і ў большай ступені ён сітуатыўны.

— Будзем думаць над тым, як пазбегнуць падобнага ў далейшым ці хоць бы як засцерагчы ад небяспекі педагогаў, — сказаў Ігар Шуневіч. — Ёсць сусветная практыка рэагавання на такія выпадкі, абароны выкладчыкаў — гэта ўнутраная ахова школы, сістэма забеспячэння бяспекі жыццядзейнасці навучальнай установы, у тым ліку і педагогаў. На жаль, сёння мы грэбуем такімі спосабамі.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

У САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЕ — РОЎНЫЯ ПРАВЫ

Да трэцяга Форуму рэгіёнаў засталіся лічаныя дні

Падрыхтоўка да трэцяга Форуму рэгіёнаў выйшла на фінішную прамую, а наступны, магчыма, пройдзе ў Санкт-Пецярбургу і будзе працягваць сёлетнюю тэму гуманітарнага супрацоўніцтва. Мяркуецца, што яго прысвецяць маладзёжнай палітыцы ў Саюзнай дзяржаве. Пра гэта заявіў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу нашай краіны, падчас пасяджэння арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні форуму.

— Я бачу дзве ключавыя ідэі. Першая — гэта роўныя правы грамадзян. Вядома, мінулыя пасяджэнні Форуму рэгіёнаў былі прысвечаныя сельскай гаспадарцы і прамысловасці. Мы казалі пра роўныя ўмовы для гаспадарчых суб'ектаў. Гэтым разам мы кажам пра гуманітарнае супрацоўніцтва. І было б выдатна, каб у большай ступені мы зблізілі нашы пазіцыі па стварэнні роўных правоў і ўмоў для жыцця жыхароў нашых дзяржаў. Ёсць бар'еры, якія негатыўна адбіваюцца на паглыбленні супрацоўніцтва. Іх трэба вырашаць, — адзначыў спікер верхняй палаты.

Па словах сенатара, другі кірунак, якому на форуме будзе надавацца значная ўвага, — гэта маладзёжная палітыка. Бо «ўсё, што робіцца сёння, робіцца ў інтарэсах будучых пакаленняў». «Ёсць і такая прапанова, каб чацвёрты Форум рэгіёнаў правесці з парадкам дня — маладзёжная палітыка — у Санкт-Пецярбургу. Гэта як праект на перспектыву», — падкрэсліў парламентарый.

На думку Міхаіла Мясніковіча, верагодна, што не ўсе пытанні максімальна паглыблена атрымаецца разгледзець падчас форуму. Але тут важна дамовіцца аб планах на далейшую сумесную работу ў сферах медыцынскай дапамогі, пенсійнага забеспячэння, умоў працы, атрымання адукацыі, каб максімальна забяспечыць роўныя правы грамадзян для абедзвюх дзяржаў. «Пачынаючы ад аэрапорта і скончваючы месцам жыхарства», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.

Згодна з праграмай III Форуму рэгіёнаў, 7 чэрвеня, у першы дзень мерапрыемства, адбудзецца як пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі, так і работа секцый. Адна з іх будзе прысвечана супрацоўніцтву нашых краін у сферы працоўных адносін і сацыяльнай абароны насельніцтва. Па словах **Марыяны ШЧОТКІНАЙ, міністра працы і сацыяльнай абароны**, для беларускага боку важна выявіць новыя кропкі судакранання і існуючыя праблемы ў рабоце з расійскімі калегамі. «Поўнай уніфікацыі заканадаўстваў у дзвюх розных дзяржавах ніколі не будзе і не павінна быць. Але разам з тым усё робіцца ў інтарэсах грамадзян, для таго каб яны змаглі спакойна перамяшчацца з адной краіны ў іншую без рызыкі страціць сацыяльныя правы, якія мелі раней», — падкрэсліла яна.

Акрамя таго, падчас Форуму рэгіёнаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі падпіша пагадненні аб супрацоўніцтве і ўзаемадзеянні па развіцці сацыяльна-працоўнай сферы з профільнымі міністэрствамі Астраханскай вобласці і Рэспублікі Татарстан.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■

КРАІНА Ў НОВЫМ МАЛЮНКУ СВЕТУ

У пачатку месяца Прэзідэнт падпісаў Указ «Аб скліканні пятага Усебеларускага народнага сходу». Гэтае рашэнне кіраўніка дзяржавы палажыла канец здагадкам і плёткам пра тое, што ў нашай дзяржаве нібыта адмовіліся ад такой практыкі.

Сапраўды, раней «народнае веча» — а менавіта да такой старадаўняй традыцыі адносіцца форма Усебеларускага народнага сходу — праводзілася напярэдадні найбольш знакавых палітычных кампаній, такіх, напрыклад, як прэзідэнцкія выбары, і было своеасаблівай шырокай нарадай з удзелам кіраўніцтва краіны і найбольш яркіх прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, якія напрамую ўпаўнаважаныя людзьмі і прадстаўляюць амаль усе сацыяльныя слаі насельніцтва з усіх рэгіёнаў Беларусі. Вынікі і нават сам ход такога мерапрыемства заўжды мелі стратэгічнае значэнне: фактычна на суд грамадзян выносіліся пытанні даверу да ўлады і планы развіцця краіны на бліжэйшыя пяць гадоў у найбольш важных аспектах бяспекі, эканомікі, знешняй і ўнутранай палітыкі.

Нагадаем, што, напрыклад, першы Усебеларускі народны сход адбыўся 19-20 кастрычніка 1996 года ў Мінску ў абставінах палітычнага канфлікту паміж часткай Вярхоўнага Савета з аднаго боку і камандай Прэзідэнта з іншага. Тады менавіта на Народным сходзе адбылося публічнае абмеркаванне Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця, а таксама праекта змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, што пазней былі вынесены на рэспубліканскі рэферэндум. Шырокая падтрымка пазіцыі Прэзідэнта абсалютнай большасцю дэлегатаў сходу расставіла загадзя ўсе кропкі над «і» для дасведчаных аналітыкаў адносна пазіцыі беларускага народа на будучым рэферэндуме, дазволіла правільна зарыентавацца ў сітуацыі знешнепалітычным партнёрам нашай краіны, астудзіла радыкальныя настроі асобных «гарачых галоў» палітычнай апазіцыі. Аналізуючы тыя падзеі з гісторыка-палітычнага пункту гледжання, можна сказаць, што сам факт арганізацыі прэвентыўнага «народнага веча» купіраваў палітычны канфлікт паміж галінамі ўлады, засцярог ад яго перарастання ў грамадзянскае супрацьстаянне, тым самым заклаўшы асновы стабільнасці айчыннай дзяржаўнай мадэлі.

Калі ў палітычным плане Беларусь даказала сваю сталасць, то айчынная эканамічная мадэль, якая забяспечыла развіццё нашай дзяржавы ў апошнія 20 гадоў, відавочна, патрабуе пэўнай трансфармацыі.

Гэтым разам дата правядзення Усебеларускага народнага сходу была аднесена больш чым на паўгода пасля прэзідэнцкіх выбараў, што, як ужо казалася вышэй, спарадзіла ў пэўных колах шмат дзіўных меркаванняў, якія часам больш нагадваюць не аналіз, а плёткі гандлярак семачкамі на кірмашы. Маўляў, Прэзідэнту больш няма чаго сказаць людзям. Між тым было зразумела, што мінулыя выбары, нягледзячы на іх безумоўнае гістарычнае значэнне, па сваім накале нельга было параўнаць з кампаніяй 2001-га ці, скажам, 2010 года. Тады асобныя сілы, карыстаючыся безумоўнай фінансавай і палітычнай падтрымкай шэрагу замежных краін, адкрыта праводзілі дзейнасць, скіраваную на гвалтоўную змену ўлады ў Беларусі і, думаецца, што Аляксандру Лукашэнку быў неабходны народны мандат, сімвалічная дэманстрацыя даверу і падтрымкі грамадзян як для мэт палітычнай кампаніі, так і для рашучых дзеянняў для захавання міру ў грамадстве і абароны інтарэсаў дзяржаўнай бяспекі.

Мінулыя выбары, на шчасце, прайшлі ў нашмат больш спакойных умовах і сталі сведчаннем поспеху Беларусі, калі нават адкрытыя нядобразычліўцы нашай краіны былі вымушаны адмовіцца ад палітычных дывэрсій, прызнаць права беларускага народа на ўласны шлях. Таму і Усебеларускі народны сход можна было спакойна прызначыць на больш познюю дату пасля прэзідэнцкіх выбараў і звязваць яго правядзенне не з палітычнымі кампаніямі, а з іншымі падзеямі, не менш важнымі для існавання беларускай дзяржавы.

Не будзем забываць, што летам гэтага года наша дзяржава ўваходзіць у новы этап свайго развіцця: будзе праведзена дэнамінацыя, у краіне ўводзяцца новыя грошы. Нарэшце, з'явіцца ўласная паўнавартасная свабодна канверсоўная валюта, якой можна будзе даверяць і якой можна будзе ганарыцца. Для Беларусі заканчваецца эпоха «зайчыкаў» і мільёнаў, жарты пра тое, што «ў Мінску кожны жанік мільянер», застануцца толькі для гісторыі гумару, і моладзь праз 10-15 гадоў ужо не будзе разумець гэтыя анекдоты, як многія ў наш час не разумеюць кпінаў пра часы «застою» ў Савецкім Саюзе.

Найважнейшая падзея на шляху суверэннага будаўніцтва супадае з часам правядзення пятага Усебеларускага сходу і, напэўна, гэта не дарма. Калі ў палітычным плане Беларусь даказала сваю сталасць, а апошнім часам яшчэ і атрымала добры імідж краіны-міратворцы на міжнароднай арэне, то айчынная эканамічная мадэль, якая забяспечыла развіццё нашай дзяржавы ў апошнія 20 гадоў, відавочна, патрабуе пэўнай трансфармацыі.

Як вядома, нічога не бывае вечным, любыя тэхналогіі старэюць, ім на змену прыходзяць іншыя. Ад здольнасці краін, рэгіёнаў ці карпарацый адаптавацца да навукова-тэхнічнага прагрэсу залежыць іх месца ў новым свеце. Яшчэ нядаўна кіраўніцтва Расіі вельмі ўтульна адчувала сябе ў ролі «нафтагазавага манапаліста», а зараз з вуснаў прадстаўнікоў расійскай эліты на адрас уласнай мадэлі гучаць абвінавачванні накшталт «краіна-даўншыфтар». ЗША прапануюць развітым рэгіёнам свету новую эканамічную сістэму ў фармаце двух «партнёрстваў» — Трансатлантычнага і Трансціхаакіянскага. У выпадку ўдалай рэалізацыі гэтай ідэі ў зоне свабоднага гандлю вакол Вашынгтона аб'яднаецца абсалютная частка сусветнай эканомікі. Аналітыкі сцвярджаюць, што сінергетычны эфект ад такога аб'яднання зможа прывесці да небывалага тэхналагічнага рыўка Захаду ў інтарэсах буйнога капіталу транснацыянальных карпарацый. У свеце яшчэ больш умацуецца рэгіянальны разрыў паміж багатымі і беднымі, і гэтае адставанне можа набыць нераадольны характар. У такіх умовах усе краіны, у тым ліку і наша, мусяць задумацца аб сваім месцы ў новай канфігурацыі свету, стратэгічных задачах развіцця эканомікі, бо цалкам магчыма, што Беларусь будучыні — гэта ўжо не МАЗ, а Парк высокіх тэхналогій, прыбыткі ад якога летась былі большымі за прыбыткі ад машынабудавання.

Бачыцца правільным, каб у Беларусі паралельным курсам развіваліся і машынабудаванне, і інтэрнэт-тэхналогіі. Бачыцца мэтазгодным, калі менавіта такія стратэгічныя пытанні развіцця нашай дзяржавы беларускае кіраўніцтва вынесла на народную нараду. Аляксандр Лукашэнка неаднаразова казаў, што «найбольш значны выклік для Беларусі — гэта эканоміка», і хочацца, каб айчынныя адказы на эканамічныя пагрозы былі такім ж упэўненымі, як і на палітычныя пытанні.

Аляксандр ШПАКОЎСКІ,
дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя».

АДЗІНСТВА САМАБЫТНАСЦЯЎ

На святе нацыянальных культур у Гродне ўпершыню выступяць шрыланкійцы, нігерыйцы і амерыканец

Ужо літаральна праз паўтара тыдня, 4-5 чэрвеня, у Гродне пройдзе XI Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. Гэта ўнікальны форум, які не мае аналагаў у іншых краінах. На ім выступяць прадстаўнікі розных дыяспар, што пражываюць менавіта на тэрыторыі Беларусі. Свята заклікана падкрэсліць мір і згоду, павагу і ўзаемаўзбагачэнне розных традыцый, якія здаўна існуюць на нашай зямлі.

Сёлета на фестываль запрошаны прадстаўнікі ЮНЕСКА, пра што паведаміў **намеснік міністра культуры Беларусі Васіль ЧЭРНІК**:

— У гэтым годзе адразу два рэспубліканскія фестывалі — нацыянальных культур у Гродне і фальклорнага мастацтва «Берагіня» ў гарадскім пасёлку Акцябрскі — упершыню пройдуць пад патранатам буйной міжнароднай арганізацыі. З такой прапановай выступіла ЮНЕСКА, і яна знайшла падтрымку Міністэрства культуры. Мы запрасілі прадстаўнікоў гэтай супольнасці завітаць на нашы святы, і, спадзяёмся, яны змогуць прыехаць.

У фінальных мерапрыемствах фестывалю ў Гродне прымуць удзел прадстаўнікі 38 нацыянальнасцяў — абшчыны і калектывы, адабраныя падчас рэгіянальных тураў форуму ў розных куткаў краіны. Прычым упершыню будуць прадстаўлены шрыланкійцы, нігерыйцы і амерыканец. Удзельнікі з Шры-Ланкі і Нігерыі — студэнты беларускіх ВНУ, а амерыканец — васьмігадовы хлопчык-саксафаніст Максім Сарока, бацька якога родам з ЗША. Усяго ж у Гродне збяруцца 800 удзельнікаў, з іх 330 пражываюць у Мінску.

Па словах **дырэктара Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Вольгі АНТОНЕНКІ**, праграма фестывалю будзе насычанай, да яе далучацца зоркі беларускай эстрады. Так, у межах аднаго з праектаў вядомыя артысты выканаюць песні на нацыянальных мовах тых краін, родам з якіх іх продкі. Напрыклад, Іскуі Абалян праспявае на армянскай. Запланавана работа розных канцэртных пляцовак, падворкаў, дзе можна будзе пакаштаваць стравы нацыянальнай кухні.

Да сёлетняга фестывалю выпушчаны фотаальбом — своеасаблівы летапіс яго правядзення. Гэта выданне ўключае здымкі, зробленыя за 20 гадоў існавання свята. Прэзентацыя альбома адбудзецца 4 чэрвеня, у дзень адкрыцця, на пляцоўцы аднаго з мясцовых кінатэатраў.

Варта адзначыць, што замежнікі таксама праяўляюць цікавасць да фестывалю. Аднак асаблівасць гэтага форуму заключаецца ў тым, што на яго ў якасці ўдзельнікаў не запрашаюцца госці з іншых краін. «Але ў аргкамітэце фестывалю ляжыць шмат лістоў, якія мы атрымалі з-за межаў Беларусі, з просьбай даць магчымасць прыехаць на фестываль і выступіць на яго канцэртных пляцоўках», — адзначыў Васіль Чэрнік. Часцей за ўсё звароты з гэтай нагоды прыходзяць з Латвіі, Літвы і Расіі. Пры жаданні замежныя госці могуць прыехаць на фінальныя мерапрыемствы фестывалю, але ў якасці гасцей, а не ў якасці ўдзельнікаў. Сёлета на фінальны канцэрт таксама не запрошаны замежныя зоркі, артысты з Расіі — усю канцэртную праграму выканаюць беларускія спевакі.

Афіцыйнай песняй фестывалю нацыянальных культур стане твор беларускага кампазітара Алены Атрашкевіч. Кампазіцыя абраная арганізатарамі ў якасці галоўнага і пазнавальнага музычнага суправаджэння XI Рэспубліканскага фестывалю. Упершыню яна прагучала на мінскім рэгіянальным адборачным туры і запомнілася слухачам. Песня прагучыць на адкрыцці і закрыцці фінальных мерапрыемстваў у Гродне. Мелодыя будзе служыць пазыўнымі падчас выпуску тэледзённікаў. Калі ўдзельнікі і гледачы ўхваляць такі выбар, магчыма, кампазіцыя стане афіцыйнай песняй-гімнам фестывалю нацыянальных культур і надалей.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

■

АРАНДАТАРЫ Ў СУЧАСНАЙ КАМУНАЛЬЦЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У дадзеным выпадку мы сутыкаемся з амаль нераадольнымі цяжкасцямі. Без згоды саўладальніка кватарантаў можна засяліць толькі па рашэнні суда. А каму захочацца жыць побач з чалавекам, які першапачаткова быў супраць? — разважае **Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчык сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама**, якая прапануе перагледзець нормы Жыллёвага кодэксу, каб спрасціць жыццё ў камуналцы. — Прычын для набыцця пакоя ва ўласнасць можа быць мноства. Ад падзелу кватэры паміж мужам і жонкай да набыцця маёмасці як крыніцы прыбытку праз яго арэнду. Апошняе тычыцца і сітуацыі, у якую трапіў 15-гадовы сірата-інвалід — гаспадар памяшкання ў адной з мінскіх двухпакаёвак (гл. «Звязду» за 19 мая). Сваякі набылі яму пакой, каб хлопец меў дадатковы прыбытак да сваёй і бабулінай пенсій. Але сталася так, што жанчына, якая даглядае ўнука, што не можа жыць асобна, замест атрымання прыбытку з метраў цяпер мусіць плаціць за іх штомесяц дадатковыя 600 тысяч рублёў камунальных. Такая вось недарэчнасць.

Пакой, куплены для сіраты пару гадоў назад за 30 тысяч долараў, зараз каштуе каля 20 тысяч. Такім чынам, немагчыма ўцячы ад псіхалагічна дыскамфортнага суседства праз продаж маёмасці, каб не згубіць грошы. Палюбоўна дамовіцца з суседам па камуналцы не атрымліваецца. Прымусовае рашэнне суда (калі яно будзе) таксама не вельмі натхняе, што знойдзецца кватарант, які захоча жыць у такіх умовах.

— Пераязджаць у 17-метровы пакой бабулі з унукам і здаваць сваю аднапакаёўку, якую яны займаюць цяпер, — таксама не выйсце. Там у хлопца зручныя ўмовы для жыцця: першы паверх, свая кухня, адсутнасць чужых людзей. У той жа час набыты пакой пакуль прыносіць толькі клопаты, а не дапамогу. Каб выбрацца з жыллёвай «пасткі», трэба не спрачацца ў судзе, а мяняць заканадаўства, — пераканана Зінаіда Вараб'ёва. — Такі выпадак далёка не адзінкавы. Шмат хто з грамадзян, якія ўклалі грошы ў нерухомасць у выглядзе пакоя ў камуналцы, але не сышліся характарамі з суседзямі па кватэры, не могуць цяпер атрымаць з маёмасці аніякай карысці. Каб чалавек адчуў сябе паўнавартасным гаспадаром жылля, трэба даць яму магчымасць распараджацца ім па сваім меркаванні, незалежна ад чыіхсьці згоды ці пярэчання. Гэта ў цэлым, а калі ў прыватнасці, то я лічу мэтазгодным змяніць сітуацыю ў дачыненні дзяцей-сірот і, магчыма, дзяцей-інвалідаў, ва ўласнасці якіх ёсць жыллё. Такіх выпадкаў — адзінкі, але яны ёсць.

Цяпер у камунальных кватэрах, якіх у Беларусі больш за 240 000, жыве каля мільёна чалавек. Усе яны ў розных адносінах са сваімі суседзямі, аднак без агульнай згоды ўсіх уладальнікаў засяліць у камуналку кватарантаў не зможа ніводзін. У дэпутатаў прапанова прадстаўніцы Мінгарвыканкама, скіраваная на паляпшэнне жыцця ў камуналках, выклікае розныя думкі і сумненні. Перш за ўсё непакоіць пытанне, не зрабіць бы горш, чым ёсць.

— Людзі, якія жывуць у камуналках, як правіла, з'яўляюцца сваякамі або былымі сужэнцамі, і адносіны паміж імі часцей за ўсё і так канфліктныя. Забарона на засяленне ў камунальныя метры арандатараў спецыяльна і прадугледжвалася, каб не пагаршаць становішча яшчэ больш. Калі мы дазволім здаваць пакоі ў арэнду без згоды саўладальнікаў, мы атрымаем яшчэ большае сацыяльнае зло, — упэўнены **Уладзімір ПУЗЫРЭЎСКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.** — Уявіце, што ўладальнік трох метраў здасць іх камусьці ў арэнду. На такую плошчу нават ложак не змесціцца, а зусім чужы чалавек будзе карыстацца і кухняй, і ваннай, і санвузлом. Што атрымаецца? Пастаянныя сваркі. Асабіста я супраць такога дазволу. А калі нехта хоча мяняць заканадаўства, няхай збірае подпісы грамадзян ці звяртаецца да дэпутатаў па месцы пражывання.

— Уладальнік кватэры поўнасцю адказны за тое, што ў ёй адбываецца. Засяляючы замест сябе ў пакой кватаранта, гаспадар можа пераследаваць розныя мэты. Магчыма, ён захоча не грошы зарабіць праз арэнду, а, напрыклад, псіхалагічна ўздзейнічаць на іншага саўладальніка, пусціўшы ў свой пакой якога бамжа, — разважае **Аляксандр ЦАЦОХА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.** — Каб не выпусціць джына з бутэлькі, перш чым перарабляць закон, трэба сур'ёзна і ўсебакова прапрацаваць гэтае пытанне. Перш за ўсё, арэнду трэба абавязкова афіцыйна афармляць, а пра кватаранта — мець максімальна поўныя звесткі. Увогуле, я цалкам згодны, каб заканадаўства ў гэтай галіне было зменена на карысць людзям. Асабліва ў дачыненні да сацыяльна неабароненых катэгорый грамадзян.

Ірына СІДАРОК, *sidarok@zviazda.by*

Алена Трафімаўна, адстойваючы інтарэсы ўнука, сабрала тамы дакументаў.

P.S. *Бабулі падлетка, пра якога пісала «Звязда», Алена і Галіна Трафімаўны не пакідаюць надзеі, што справа вырашыцца на карысць унука. Кіруючыся парадай адваката прыходзіць у суд з патэнцыйным арандатарам, яны знайшлі чалавека, які жадае жыць у пакоі, што належыць Уладзіславу. Гэта малады афіцэр міліцыі, які ведае пра праблемы паміж саўладальнікамі. Ён згодны суіснаваць на адной тэрыторыі з урачом, які адстойвае сваю прынцыповую пазіцыю, нават калі дазвол на гэта будзе атрыманы праз суд. Толькі вось зусім невядома, ці хопіць у афіцэра цярпення і вытрымкі, каб прайсці праз судовыя выпрабаванні. Да таго ж зусім не факт, што суддзя вынесе рашэнне на карысць падлетка. У гэтай гісторыі застаецца яшчэ шмат сумневаў, і пра шчаслівы фінал казаць пакуль рана...*

■ Падпіска-2016

З АДКРЫТАЙ ДУШОЙ

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Май дорыць звяздоўцам мноства прыемных сустрэч.
У рамках правядзення Дзён падпісчыка мы наведалі шэраг адметных куткоў роднай Беларусі. І даведаліся безліч цікавага пра самыя розныя мясціны.
Можам, як кажуць, з усёй адказнасцю засведчыць: «Звязду» чытаюць, яе з нецярплівасцю чакаюць, ёй вераць.**

**Мы са свайго боку, зразумела, адчуваем вялікую адказнасць перад сваімі чытачамі.
І працягваем ладзіць душэўныя сустрэчы.
Заўтра Дні падпісчыкаў «Звязды» пройдуць адразу ў некалькіх рэгіёнах.
27 мая з 10 да 13 гадзін сустрэнемся на раённым вузле паштовай сувязі (РВПС) Валожына. У гэты ж дзень з 12 да 15 гадзін чакаем вас на Бярозаўскім РВПС. Да сустрэчы!**

ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМУ ПА ТЭЛЕФОНЕ

Набіраць па суботах нумар гарадской, раённай ці абласной адміністрацыі — ужо традыцыя. З 9 да 12 гадзін чыноўнікі выходзяць на сувязь з насельніцтвам. Паводле вопыту мінулага года, спецыялісты адзначаюць, што ў перыяд летніх адпачынкаў і дачнага сезона колькасць званкоў становіцца меншай. Але ўсё роўна не абыходзіцца суботняя тэлефонная размова без пытанняў ЖКГ. Просьбы беларусаў цяпер з летнім адценнем, і самай папулярнай тэмай для абмеркавання стала ўладкаванне паркаў, сквераў і зялёных зон для адпачынку.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 28 мая, правядуць:

Брэсцкі аблвыканкам
намеснік старшыні САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
намеснік старшыні МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
намеснік старшыні БУБЕНЧЫК Алена Аляксандраўна (80152735644);

Магілёўскі аблвыканкам
намеснік старшыні МАЛАШКА Валерый Анатолевіч (80222501869);

Мінскі аблвыканкам
намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160);

Мінскі гарвыканкам
намеснік старшыні ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч (80172224444).

■ Молада-зелена!

САХАТЫ ХУЛІГАН

У Мёрах лось зайшоў на школьны двор і пабіў вокны

Раніцай на тэрыторыі сярэдняй школы №3, што знаходзіцца на ўскраіне горада, заўважылі сахатага. Праўда, вучні прынялі дзікую жывёліну за каня, бо рагоў на галаве ў верагодна зусім маладой жывёлы не было. Па расказах відавочцаў, лось прабегся каля школы, пасля чаго прысутныя пачулі гук разбітага шкла. Ад нечаканага візіту пацярпелі чатыры акны. На жаль, зняць інцыдэнт на камеру школьнікам не ўдалося, настолькі яны былі шакаваныя з'яўленнем такога незвычайнага госця.

— Магчыма, прычынай выпадку паслужылі некаторыя асаблівасці паводзін маладых асобін гэтага віду, — расказаў **загадчык лабараторыі тэрыялогіі навукова-практычнага цэнтра НАН па біярэсурсах Рыгор ЯНУТА.** — Перыяд гону звычайна прыпадае на верасень і кастрычнік, а патомства з'яўляецца на свет якраз у красавіку-маі. Ласяняты застаюцца з самкай да з'яўлення на свет новай генерацыі. Таму, хутчэй за ўсё, заўважаная ў Мёрах асобіна — гэта зусім малады лось, які толькі-толькі пачаў самастойнае жыццё і цяпер спазнае навакольны свет. Пабіць шкло ён мог, напрыклад, пабачыўшы ў ім сваё адлюстраванне. А сам факт з'яўлення жывёлы ў населеным пункце мяне зусім не здзіўляе — колькі гадоў таму ласёў сустракалі ў самым цэнтры беларускай сталіцы — у парку Чалюскінцаў.

Паводле сцвярджэння навукоўца, патэнцыйна гэтае млекакормячае можа несці для чалавека пагрозу хоць бы з той прычыны, што яго вага часам дасягае 600 кілаграмаў. Асаблівую небяспеку ласі ўяўляюць у перыяд гону, калі паводзяць сябе даволі агрэсіўна. Таму, сустрэўшы жывёлу ў прыродзе, лепш абысці яе бокам. У астатні ж час сахатыя самі пазбягаюць прамых кантактаў з чалавекам.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■

■ Будзь у курсе!

Дарога да Балтыкі

З 1 чэрвеня ўводзяцца спецыяльныя тарыфы на поезд Мінск—Рыга.

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі, будзе прымяняцца гнуткі графік змянення цаны праезду ў поездзе міжнародных ліній №88/87 Мінск—Рыга. Па ўзгадненні з Латвійскай чыгункай ён будзе дзейнічаць да канца года. У гэты перыяд будуць дзейнічаць зніжкі і надбаўка да агульнага кошту праезду ва ўсіх катэгорыях вагонаў у залежнасці ад тэрміну продажу (глыбіні продажу) білетаў. Так, зніжка ў 15 працэнтаў будзе дзейнічаць пры ўмове продажу дакументаў за 45-31 суткі да адпраўлення поезда, 10 працэнтаў — пры продажы за 30-21 суткі. Пры набыцці білета за 20-11 сутак да паездкі прымяняецца базавая цана. Надбаўка ў памеры 3 працэнтаў уводзіцца пры продажы білета за 10 сутак і менш да адпраўлення поезда. Таксама пры праездзе ў плацкартных вагонах на бакавых месцах дзейнічае зніжка ў 10 працэнтаў з улікам каляндарных перыядаў змянення кошту праезду.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

НА ШТО ХВАРЭЕ... МАНЕКЕН?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сапраўды, ёсць сярод гэтых амаль жывых цацак «лялькі», здольныя сімуляваць нават схваткі і крык. Да 2020 года на базе БелМАПА плануецца адкрыць сімуляцыйны цэнтр, а ў ВНУ і каледжах — сімуляцыйныя лабараторыі. Фінансаванне праекта будзе ажыццяўляцца з розных крыніц, у тым ліку з удзелам Сусветнага банка.

ПРА КАДРЫ

— Няправільна гаварыць сёння аб дэфіцыце кадраў у галіне аховы здароўя, — адзначае Вольга Маршалка. — Існуе паняцце патрэбы. У выніку рэалізацыі праграмы «Кадры» была праведзена вялікая работа, і мы выйшлі на максімальнае аднаўленне патрэбы, якая штогод мяняецца. Вось і цяпер вакантнымі застаюцца больш за 2 тысячы ставак урачоў і больш за 4 тысячы — медсясцёр. Але гэтыя стаўкі будуць запоўненыя ў жніўні маладымі спецыялістамі. А ў 2017-м наогул чакаецца двайны выпуск медыцынскіх сясцёр.

Да 2020 года ўся сістэма аховы здароўя будзе працаваць па прынцыпе ўрача агульнай практыкі.

ПРА ЎРАЧА АГУЛЬНАЙ ПРАКТЫКІ

— Ва ўсім свеце прыярытэтнай з'яўляецца менавіта агульная ўрачэбная практыка. Спецыялісты шырокіх магчымасцяў выпускаюцца ў нас ужо некалькі гадоў. Бо наяўнасць вузкіх спецыялістаў — не панацэя. Урачы агульнай практыкі, па сутнасці, валодаюць усімі «вузкімі» ведамі, і такіх нам патрэбна шмат. Да 2020 года ўся сістэма аховы здароўя будзе працаваць па прынцыпе ўрача агульнай практыкі. Адзінае, па першым часе дзесьці ўрачы ўжо будуць называцца менавіта так, а дзесьці застануцца тэрапеўты і ўчастковыя, якія будуць працаваць па прынцыпе ўрача агульнай практыкі.

ПРА МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

— Працэс замацавання кадраў павінен вырашацца комплексна, а не толькі Міністэрствам аховы здароўя. Найперш мы працуем з мясцовымі органамі ўлады над тым, каб маладым урачам прадастаўлялася жыллё. Што да аплаты працы, то сярод іншых галін, скажам, у параўнанні са сферай культуры, адукацыі, у галіне аховы здароўя заробкі большыя — дзякуючы пэўным выплатам за найм жылля, прэміі за добрыя вынікі працы, пэўным надбаўкам. Сярэдні заробак у галіне ў цэлым па краіне — 5 594 млн рублёў (ва ўрачоў — каля 9 млн, у медсясцёр — 5,7 млн).

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

■ Нябачныя масты

ШКОЛЬНІКІ ЗА БЯСПЕЧНАЕ СЕЦІВА

Беларускія падлеткі абмеркавалі праблемы інтэрнэту з равеснікамі з Японіі і Аўстраліі.

Днямі ў Свіслацкай школе №3 праходзіла міжнародная маладзёжная навукова-практычная канферэнцыя «Этыкетная культура як інструмент для стварэння этычных стасункаў у сацыяльных сетках», прысвечаная Году культуры.

Фота Рыгора ШЫРАЕВА.

Дарэчы, выбар месца яе правядзення невыпадковы. Свіслацкая школа №3 з'яўляецца адной з пяці ўстаноў адукацыі Гродзенскага рэгіёна, якія рэалізуюць праект «Класны кіраўнік у сацыяльных сетках». У школе створаны віртуальныя рабочыя кабінеты, музеі, наладжана сувязь з вучнямі і бацькамі праз сацыяльныя сеткі. Канферэнцыя стала завяршальным этапам праекта, падчас якога ўдзельнікі дзяліліся вынікамі працы.

Па словах **намесніка дырэктара школы па вучэбнай рабоце Ларысы ТУМІЛОВІЧ**, падчас форуму працавала некалькі секцый: «Фарміраванне маўленчай культуры ў працэсе стасункаў у інтэрнэт-прасторы», «Камунікатыўная культура ў сацыяльных сетках», «Камп'ютарныя гульні як сацыякультурны феномен», «Сацыяльныя сеткі і сеткавыя супольнасці» і «Міжнародны дыялог у полікультурнай прасторы». Акрамя таго, вучні школы паўдзельнічалі ў анлайн-дэбатах са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Але, пэўна, самай цікавай часткай форуму стаў анлайн-дыялог з вучнямі з Японіі і Аўстраліі, які правёў **настаўнік англійскай мовы Вячаслаў КАРАТКЕВІЧ,** — удзел у ім толькі з беларускага боку ўзялі каля ста школьнікаў

— Галоўнай тэмай нашага дыялогу стала абмеркаванне магчымасці выкарыстання інтэрнэту ў якасці не столькі забаўляльнага, колькі адукацыйнага рэсурсу, — расказаў ён. — Самы просты прыклад — вывучэнне англійскай мовы падчас размоў з равеснікамі, якія жывуць за мяжой. Пытанняў было вельмі шмат. Пачалі, напрыклад, з такога: «Чаго ў інтэрнэце больш: плюсаў ці мінусаў?» Сышліся на думцы, што пазітыўнага ўсё-такі больш. Ці вось яшчэ: «Якім чынам інтэрнэт уплывае на адукаванасць дзяцей: яны атрымліваюць больш інфармацыі ці становяцца лянівымі?» Тут ужо ўсё было не так адназначна, бо прыкладаў, калі дзеці замест вывучэння замежнай лексікі карыстаюцца анлайн-перакладчыкамі, вельмі шмат. Вядома, закраналі пытанні інтэрнэт-слэнгу, камп'ютарных гульняў, у якіх зашмат агрэсіі, але гэта традыцыйныя тэмы. А вось школьнікі з Японіі закранулі адносна новую праблему, спытаўшы, ці ёсць у Беларусі з'ява так званага «булізму» (ад англійскага слова «bulle» — «бык») — цкавання, якое дзеці арганізуюць у інтэрнэце супраць вучняў, якія ім не падабаюцца. Безумоўна, падобнае бывае ў самых розных дзіцячых калектывах, але мы прыйшлі да высновы, што для нашай краіны гэта праблема пакуль не такая актуальная.

Ужо чатыры гады настаўнік наладжвае сувязі са школьнікамі з іншых краін, каб яго вучні маглі не толькі практыкавацца ў замежнай мове, але і знаходзіць новых сяброў. За гэты час хлопцы і дзяўчаты са Свіслачы ўжо шмат разоў ладзілі анлайн-абмеркаванні самых розных праблем з замежнікамі, знаёміліся з іншымі краінамі праз расказы сваіх аднагодкаў. Аўстралія, В'етнам, Тайвань, Тайланд, Японія — спіс краін, дзеці з якіх віртуальна «пабывалі» ў Беларусі, пастаянна папаўняецца.

Па выніках канферэнцыі школьнікі склалі адмысловую дэкларацыю, у якой вылучаны галоўныя праблемы грамадства, звязаныя з інтэрнэтам, і вылучаны магчымыя шляхі іх вырашэння. Сярод значных, на думку ўдзельнікаў, праблем — падлеткавая інтэрнэт-залежнасць, забруджванне мовы жарганізмамі, распаўсюджванне небяспечнай інфармацыі, пагроза для канфідэнцыяльных звестак, маўленчая агрэсія і іншае.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

ЗРОБІМ СВЕТ БОЛЬШ ЗРУЧНЫМ

Дапамагчы ў гэтым можа ўніверсальны дызайн

Аўтобусны прыпынак «Дзіцячая бальніца» на праспекце Кіжаватава ў Мінску. На слупе — шыльдачка з раскладам руху транспарту. Вось толькі вісіць яна так высока, што азнаёміцца з гэтым самым раскладам праблематычна нават людзям з добрым зрокам і зусім нерэальна тым, у каго ён хоць бы трохі зніжаны. Навошта яна тады патрэбная?..

Цяпер у свеце набірае папулярнасць паняцце ўніверсальнага дызайну. Што гэта такое? Часта ўніверсальны дызайн называюць яшчэ «дызайнам для ўсіх», таму што ён закліканы зрабіць навакольнае асяроддзе і прадметы максімальна зручнымі для ўсіх без выключэння людзей.

Прыгледзьцеся як-небудзь да тых, хто ідзе вам насустрач па вуліцы. Сярод мінакоў будзе нямала маладых мам з дзіцячымі каляскамі, падлеткаў, пажылых, тых, хто нясе цяжкія сумкі, ды і проста стомленых людзей. Гэта без уліку яшчэ тых, у каго ёсць інваліднасць...

Паняцце «безбар'ернае асяроддзе» ўжо худа-бедна ўвайшло ў наша жыццё, хоць яшчэ і далёка не цалкам. Архітэктары-практыкі да гэтага часу кажуць, што гэта вельмі нязручныя пытанні. «У нас распрацаваны нядрэнныя дакументы, дзе прапісаны патрабаванні для забеспячэння безбар'ернага асяроддзя. І праекціроўшчык можа яго забяспечыць. Але тут ён уступае ў канфлікт з заказчыкам, якому гэта зусім не патрэбна. Як правіла, заказчыкі ў нас здаровыя людзі, і праблемы інваліднасці іх не цікавяць, таму што гэта дадатковыя выдаткі. Прайдзіцеся па нашых грамадскіх будынках, вакзалах, прыпыначных пунктах... нідзе няма стопрацэнтнай адпаведнасці ўсім патрабаванням», — сказаў «Звяздзе» адзін з праекціроўшчыкаў.

Універсальны дызайн не прыстасаваны для нейкай пэўнай сацыяльнай групы, напрыклад, выключна для людзей з інваліднасцю. У той жа час ён з'яўляецца важным складнікам даступнага асяроддзя і дазваляе палегчыць жыццё не толькі людзям з абмежаванымі магчымасцямі, але адначасова і ўсім астатнім. Бо, напрыклад, на вакзале кожны з нас будзе толькі рады пандусу, па якім лёгка скаціць сумку на калёсіках.

Канцэпцыя ўніверсальнага дызайну пакуль новая для Беларусі і выклікае шмат пытанняў. Ці будуць прафесіяналы арыентавацца на яго? Ці не прывядуць новыя падыходы да падаражэння праектаў? Як узгадняюцца прынцыпы ўніверсальнага дызайну з нашым заканадаўствам?

Спецыялісты адзначаюць, што калі якасна прадумаць праект, то гэта не прывядзе да падаражэння аб'екта. А вось перабудаванне таго, што было пабудавана з парушэннем нарматываў, ужо патрабуе фінансаў.

Часам стварэнне даступнага і камфортнага асяроддзя і зусім не патрабуе выдаткаў — дастаткова, нешта робячы, проста хоць бы на хвіліну ўявіць, ці зручна будзе гэтым карыстацца іншым людзям. І павесіць шыльдачку з раскладам транспарту крыху ніжэй, калі ўжо браць прыклад, прыведзены ў пачатку гэтага артыкула.

На адкрытай дыскусіі, якая нядаўна адбылася ў Мінску, **дацэнт кафедры архітэктуры жылых і грамадскіх будынкаў БНТУ**, аўтар навуковага выдання «Універсальны дызайн адкрытых прастораў, будынкаў і збудаванняў» **Наталля ЛАЗОЎСКАЯ** зазначыла:

Часам стварэнне даступнага і камфортнага асяроддзя зусім не патрабуе выдаткаў — дастаткова, нешта робячы, проста хоць бы на хвіліну ўявіць, ці зручна будзе гэтым карыстацца іншым людзям. І павесіць шыльдачку з раскладам транспарту крыху ніжэй.

— Сёння ў нас дзейнічаюць нарматывы, поўнае выкананне якіх здольна зрабіць наша асяроддзе зручным і даступным. Архітэктурныя праекты ствараюцца з улікам патрабаванняў даступнасці, але на ўведзеных аб'ектах мы фіксуем парушэнні і неадпаведнасці нормам. У цэлым, калі кажуць аб безбар'ерным асяроддзі, то маюць на ўвазе стварэнне асобных элементаў асяроддзя і забываюць пра сістэмнасць. Вось і атрымліваецца, што ў нас ёсць даступныя пераходы, але яны не ўключаныя ў непарыўную пешаходную сетку. І гэта толькі адзін з прыкладаў. Канцэпцыя ўніверсальнага дызайну — гэта тое, што можа змяніць сітуацыю.

Наогул, трэба памятаць, што кожнаму чалавеку можа спатрэбіцца камфортнае, даступнае асяроддзе, бо мы не становімся маладзейшымі, і заўтра лесвіца ў дваццаць пяць прыступак можа стаць непераадольнай перашкодай для любога з нас.

Дарэчы, за мяжой уласнікі разумеюць выгады даступнасці іх аб'ектаў для ўсіх. Так, ужо падлічана, што прыбытак крамы, якая не мае парога на ўваходзе, вышэй на 15% у параўнанні з той крамай, у якой ён ёсць.

Святлана БУСЬКО, *busko@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск № 10 (53)

ДЗІЎНЫЯ ЛЮДЗІ

У роднага брата каляжанкі нарадзілася дачушка. «Я стала цётачкай! — радуецца тая. — На гэтым тыдні паедзе забіраць жонку з радзільні. Запыталася, як будзе сустракаць? «Лімузін па-любому, — кажа ён. — Яшчэ кветкі. Ужо працэнтаў 70 для сустрэчы ёсць. Звярнуся ў святочнае агенцтва, мо, нешта прапануюць? А ты што параіш? Надзя хацела, каб усё было прыгожа...» Я параіла саксафаніста і ў лімузін шары з геліем».

«Лімузін, шары...Навошта? — здзіўляецца старэйшая знаёмая, маці трох дзетак. — Вельмі шмат стала ў нашым свеце вонкавага — на публіку... Нараджэнне дзіцяці — гэта нешта вельмі сямейнае, вельмі глыбокае, патаемнае. Тое, што павінна быць толькі для іх: жанчыны, якая нарадзіла, мужчыны, які стаў бацькам, і немаўляці, што толькі некалькі дзён на гэтым свеце, і якому, канешне, няма да ўсяго гэтага справы. Мне падаецца, што за прыгожай карцінкай можа нейкі важны змест згубіцца».

«Дарослыя вельмі любяць лічбы. Калі вы расказваеце ім пра свайго новага сябра, іх ніколі не цікавіць самае галоўнае. Яны ніколі не спытаюць: «Які ў яго голас? Якія гульні ён любіць? Ці збірае ён калекцыю матылькоў?» Яны пытаюць: «А колькі яму гадоў? Колькі ў яго братоў? Колькі ён важыць? Колькі зарабляе яго бацька?» І толькі тады ім будзе здавацца, што яны ведаюць яго...

Калі вы скажаце дарослым: «Бачыў я адзін прыгожы дом з чырвонай цэглы, з геранню на вокнах, з галубамі на даху... Яны ніяк не змогуць уявіць, што гэта за дом. Ім трэба сказаць: «Бачыў я дом, які каштуе сто тысяч франкаў». І тады яны ўсклікнуць: «О, як гэта прыгожа!»

...Я баюся стаць падобным да людзей дарослых, якіх нічога не цікавіць, апрача лічбаў, — уздыхнуў Маленькі прынц. — Бо...

...Гэтыя дарослыя — вельмі дзіўныя людзі... Яны могуць выгадаваць пяць тысяч ружаў у адным садзе... і не знаходзяць таго, чаго шукаюць. А між тым тое, што яны шукаюць, можна знайсці ў адной-адзінай ружы альбо ў адным глытку вады... Але вочы — сляпыя. Трэба шукаць сэрцам. Самае галоўнае схавана ад вока.

...Адны толькі дзеці ведаюць, чаго яны шукаюць. Яны ўсё аддаюць ляльцы, зробленай з анучак, і яна становіцца для іх самай неабходнай. І калі яе адымаюць у іх, дзеці плачуць. Яны шчаслівыя!..»

Калісьці даўно ў адным горадзе жыў мудрэц. Слава пра яго мудрасць разнеслася па усёй краіне: людзі здалёк прыходзілі па параду. Але быў у горадзе чалавек, які зайздросціў мудрацу. Прыйшоў ён неяк на луг, злавіў самага прыгожага матылька, схаваў яго паміж далонямі і падумаў: «Вось пайду да мудраца і спытаюся ў яго: які матылёк у мяне ў руках — жывы ці мёртвы? Калі ён скажа — «мёртвы», я адкрыю далоні і матылёк паляціць. Калі ён скажа — «жывы», я сцісну далоні і матылёк памрэ. Вось тады ўсе зразумеюць, хто з нас разумнейшы».

Сказана — зроблена. Зайздроснік прыйшоў да мудраца і пытаецца: «Скажы, о наймудрэйшы, які матылёк у мяне ў руках — жывы ці мёртвы?»

Мудрэц паглядзеў на яго ўважліва і ціха прамовіў:

— Усё ў тваіх руках!

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

■ Тыя, хто побач

МОЙ ВЕЛІСТРУХЕН З'ЕЛА МОЛЬ,

або Як смокінг ператварыўся ў сямейны тэатр

Фота Надзеі БУЖАН.

Некалькі гадоў таму замежная сяброўка даслала мне малюнак пад назвай «Варэнне з зорак». «Знайшла гэтую беларускую мастачку на прасторах інтэрнэту. Здаецца, табе спадабаецца! Ганна Сілівончык!» Сапраўды, я тады з першага погляду ўлюбілася ў яе казачныя, душэўныя карціны. А зусім нядаўна пазнаёмілася з іх стваральніцай. А дакладней, з усёй неверагодна творчай сям'ёй Ганны: мужам Васілём Пешкуном і 13-гадовай дачкой Машай. Размаўляем спачатку дома, на канапе, затым — у машыне па дарозе на выставу Валянціна Губарава.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

■ Насуперак стэрэатыпам

ПУЧОК ПЯТРУШКІ ЗАМЕСТ БУКЕТА

ЭКАТРЭНЕР НЕ РАЗУМЕЕ, НАВОШТА БРАЦЬ КРЭДЫТ НА ВЯСЕЛЛЕ

Раман САБЛІН да 29 гадоў быў паспяховым піяршчыкам у буйной расійскай кампаніі. Аднак пасля ў яго здарыўся... крызіс сярэдняга ўзросту. Пераасэнсаваўшы сваё жыццё, захапіўся ёгай, перайшоў на раслінную дыету, а праз некаторы час пазнаёміўся з праектам EcoWiki («Экалагічная Вікіпедыя») і стаў экаактывістам. З тых часоў Раман зніжае свой экаслед (плошча Зямлі, якая неабходна аднаму чалавеку для задавальнення сваіх патрэб цягам жыцця. — Аўт.). У кнізе «Зялёны драйвер. Код да экалагічнага жыцця ў горадзе» ён на ўласным прыкладзе патлумачыў, што значыць жыць экалагічна. Сёння першы экатрэнер Расіі матывуе іншых людзей пераходзіць на «зялёны бок» жыцця, «азеляняе» бізнес.

— Раман, з чаго пачаўся ваш рух да экалагічнасці?

— Са збору другаснай сыравіны. У Маскве я даведаўся пра акцыі па асобным зборы смецця і стаў на іх валанцёрыць. Прапанаваў суседзям па кватэры сартаваць адходы і паставіў тры скрынкі: «шкло», «пластык», «папера». Адна з суседак не пагадзілася, нягледзячы на тое, што 10 гадоў пражыла ў Германіі. «Давай дачакаемся, пакуль установяць кантэйнеры ў двары», — казала яна. Аднак я вырашыў сартаваць. Грузіў заплечнік і праз восем прыпынкаў на метро вёз усё гэтае дабро ў парк, дзе стаялі кантэйнеры для розных відаў адходаў. За тыя шэсць гадоў, што я сартую адходы, кантэйнеры ўсё яшчэ не з'явіліся ў кожным расійскім двары. Але ў Маскве і Санкт-Пецярбургу пунктаў прыёму стала нашмат больш, у прыватнасці дзякуючы акцыям «Раздзельны збор» і праекту «Збіратар». Акцыя доўжыцца тры гадзіны, за гэты час людзі раскладваюць смецце па максімальнай колькасці відаў: напрыклад, не проста пластык, а пластык 3-5 відаў. Праект некамерцыйны, гэта цэлы рух неабыякавых людзей, якія запускаюць хвалю па зніжэнні экаследу.

Зменшыць экаслед вельмі проста: напрыклад, замяніць лямпачкі на энергазберагальныя альбо святлодыёдныя.

(Заканчэнне на 7-й стар. «СГ».)

■ У бацькоўскі нататнік

ЦІ ТРЭБА ПРЫМУШАЦЬ ДЗЯЛІЦЦА,

або Як не выхаваць скнару?

З маленькай суседкай Маргарытай мы з сынам сустрэліся на дзіцячай пляцоўцы. Даня стрымгалоў пабег капаць пясок, хуценька набраў поўнае вядзерца і, ледзь падняўшы, сабраўся яго некуды несці. У гэты момант да яго спрытна падбегла Марго. Папярэджу, што абаім малым было каля двух гадоў, таму выразна сказаць, чаго хоча кожны з іх, яны яшчэ не маглі. Але ж дзяўчынка дала зразумець, што ёй патрэбна Даніна вядро і, не дачакаўшыся згоды сына, пачала вырываць яго з рук...

Гэта яна дарэмна зрабіла, бо для Дані яго вядро і шуфлік — святое, іх ён так проста нікому не дае. Таму шанцаў у Маргарыты не было, і малеча падняла крык на ўвесь двор. Я, натуральна, паспрабавала аднавіць мір паміж дзецьмі. Спачатку растлумачыла Маргарыце, што Даня сам толькі пачаў гуляць і яшчэ не гатовы аддаць ёй цацку. Не атрымалася. Малая ўчапілася ў вядро і крычала яшчэ мацней. Тут падаў голас і сын. Тады я прапанавала дзецям кампраміс: «Памяняйцеся вёдрамі. Марго, дай Дані сваё, а ты атрымаеш узамен яго». Але ў Марго вядра не аказалася. Шчыра кажучы, у яе ўвогуле не было з сабою цацак. Нарэшце з'явілася маці нашай суседачкі і, ацаніўшы сітуацыю, адным махам вынесла вердыкт: «Ну ты, Даня, і сквапны! Табе што, вядра шкада?» У мяне аж мову адняло ад такой несправядлівасці. «Можа, калі б вы бралі свае цацкі на вуліцу, іншыя не былі б сквапнымі?!» — абурана сказала ўдагонку я.

Зразумела, гэтая сітуацыя не прывяла мяне да думкі, што сын — скнара, абвінавачванне не мела падставы. Але падобныя канфлікты я назірала штодзённа. Звычайна, набавіўшыся са сваімі цацкамі, дзеці пераключаюцца на чужыя. А іх уладальнікі часцей за ўсё рэагуюць раўніва, могуць нават уступіць у бой, бо не жадаюць дзяліцца.

З нашымі пастаяннымі сябрамі і з іх мамамі мы знайшлі выйсце: абавязкова бяром на вуліцу аднолькавы набор цацак — шуфлікі вялікі і малы, мяч, трактар, формачкі і інш. Усе яны, зразумела, трошачкі адрозніваюцца, таму дзецям цікава мяняцца, і канфліктаў удаецца пазбегнуць.

Але бывае, што малы ўсё ж не хоча даваць сваё пагуляць. Ад гэтага многія мамачкі маюць супярэчлівыя пачуцці і бянтэжацца. Упрошваць аддаць, каб тваё дзіця не лічылі скнарай? Ці паважаць права дзіцяці самому распараджацца сваёй маёмасцю? А ці не будзе ў яго з-за такой незаворлівасці потым цяжкасцяў у дзіцячым калектыве? Ахопліваюць сумненні. Давайце разбірацца.

P.S. *Шчыра кажучы, можа, і я напачатку дапускала пэўныя памылкі, іншы раз упрошвала сына даць камусьці машынку пагуляць. Але не так даўно ён сапраўды ўразіў мяне сваім учынкам. Мы збіраліся на дзень нараджэння стрыечнай сястры Дані. Загадзя разам з сынам старанна выбралі і купілі падарунак. І раптам перад выхадам з дому Даня спытаў, ці можна яму падараваць сваёй сястрычцы ўласную цацку. Мы нагадалі, што купілі прыгожы падарунак і гэтага будзе дастаткова. Але Даня нібы не пачуў, усё бегаў з пакоя ў пакой, шукаў нешта. Калі мы ўжо ўручылі падарунак імянінніцы, сын нечакана выняў з кішэні зялёны пластмасы бранзалет і трапятліва працягнуў малой. Мы з мужам здзівіліся, бо добра ведалі, што гэта за рэч. З гэтым бранзалетам Даня ніколі не расставаўся, нават у ложак з сабою браў, прыдумляў з ім новыя гульні і вельмі перажываў, калі ён губляўся. Мы нават не разумелі, чаму ён такі дарагі малому. Але ж дзеці часта маюць прыхільнасць да, як здаецца нам, дарослым, зусім звычайных рэчаў. Імянінніца, зразумела, не выказала бурных уражанняў наконт даволі простага падарунка, але мы заўважылі, што Даня застаўся вельмі задаволены.*

Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.

ПАРАДЫ МАМАМ І ТАТАМ

1. Псіхолагі сцвярджаюць цікавую рэч: калі хочаш выхаваць сапраўднага скнару — прымушай яго быць шчодрым. Тыя, каго ў дзяцінстве бясконца прымушалі аддаваць сваё, вырастаюць або няўпэўненымі людзьмі, якія не могуць сказаць «не» і ад гэтага пакутуюць, або становяцца занадта скупымі.

Справа ў тым, што ў 2-3 гады фарміруецца дзіцячае «я», пачуццё ўласнасці. І сваю маёмасць, у тым ліку і цацкі, малеча ўспрымае як частку самога сябе. А калі нехта квапіцца на любімае пластмасавае вядзерца, паказвае нязгоду, абараняе «сваё». І мае на гэта поўнае права. Таму ні ў якім разе не трэба настойваць, каб дзіця дзялілася супраць свайго жадання. Яно нават не зразумее, чаму павінна аддаць сваё, навошта? Калі наспявае канфлікт, прапануйце дзецям абмяняцца цацкамі, парайце пагуляць разам або пераключыце іх увагу на нешта іншае. Не дапамагло? Сыдзіце на іншую пляцоўку і пасля таго, як малы супакоіцца, абмяркуйце з ім гэтую сітуацыю.

2. Некаторыя мамы баяцца, што стараннія будуць лічыць яе дзіця прагным, асудзяць выхаванне. І здольны нават забраць цацку ў свайго і аддаць чужому. Яшчэ і прысаромяць, насварацца. Ваш малы зразумее гэта як здраду, а не ўрок дабрыні. Такая самаахвярнасць нікому не на карысць. Адстойвайце інтарэсы свайго дзіцяці. «Можа, усё ж такі дасі Волечцы шуфлік пагуляць, не назаўсёды?» — зрабіце спробу пераканаць малое. Калі ўсё роўна «не», растлумачце дзяўчынцы, што ваша Таня пакуль сама хоча пагуляць, а пасля, можа, і ёй дасць.

Просты прыклад: уявіце сабе, што нехта на вуліцы раптам просіць даць яму пагуляць з вашым тэлефонам або пракаціцца на вашай машыне. Вядома, нас, дарослых, такая просьба здзівіць, і мы адмовім. Дык чаму ж дзеці павінны так лёгка аддаваць уласную маёмасць?

Чакайце моманту, калі малы пачне дзяліцца свядома. Не прыспешвайце. Жаданне павінна прыйсці па загадзе душы, а не пад ціскам.

3. Калі дзіця вельмі беражліва ставіцца да цацак і з-за гэтага не хоча дзяліцца, не бярыце на вуліцу вельмі дарагія яму рэчы. Каб пазбегнуць канфліктаў з дзецьмі, якія прыйдуць да вас у госці, схавайце найбольш любімыя і пакіньце тыя, з якімі сын ці дачка з лёгкасцю дадуць пагуляць.

У дзіцячы садок браць цацкі можна толькі ў тым выпадку, калі даваць з імі гуляць усім дзецям. Хвалюецеся, што тыя пашкодзяць рэч, тады лепш пакіньце яе дома.

4. Ва ўзросце 3-5 гадоў дзеці ўжо ўмеюць дзяліцца, бо разумеюць: разам гуляць больш цікава, чым паасобку; з тым, хто дзеліцца, будуць сябраваць, а са сквапным — не. Яны з задавальненнем абменьваюцца цацкамі. Але ж навучыць дзяцей дзяліцца павінны бацькі. Лепш за ўсё зрабіць гэта на ўласным прыкладзе. Няхай малыя бачаць, як у сям'і рыхтуюць падарункі адно для аднаго і колькі гэта прыносіць радасці; што пэўныя рэчы, адзежу, якая ўжо малая, можна аддаць таму, хто ў гэтым мае патрэбу; а тату, які хутка вернецца з працы, трэба таксама пакінуць кавалачак торта.

Паглядзіце мульцікі або пачытайце казкі, дзе шчодрыя героі атрымліваюць падзяку, а скнары пасаромлены.

Вядома, што бацькі, бабулі-дзядулі імкнуцца аддаць усё самае лепшае дзецям. Не намагайцеся адмаўляцца ад усяго на карысць свайго дзіцяці, вы перашкаджаеце развіццю шчодрасці і ў выніку выхаваеце эгаіста.

5. Калі дзіця хавае свой мячык за спінай, а чужы трактар бярэ без дазволу, растлумачце, што гэта несумленна.

6. Хваліце дзяцей, калі яны з кімсьці падзяліліся або дапамаглі іншаму.

7. Каб пазбегнуць канфліктаў паміж братамі-сёстрамі, арганізуйце для кожнага дзіцяці ўласны куток: палічку, тумбачку, шафу, дзе будуць захоўвацца яго рэчы. Акрамя агульных цацак, у кожнага павінны быць свае. Растлумачце, што нельга браць ляльку сястры без дазволу і наадварот. Навучыце ветліва прасіць. Каб не выклікаць рэўнасць да брата-сястры (а гэта таксама можа стаць прычынай прагавітасці), у роўнай ступені праяўляйце да дзяцей увагу і пяшчоту.

Калі дзіця зразумее, што ёсць «маё», ён прызнае права маёмасці і іншага.

■ Займальнае чытанне

ШКОЛА ДОБРЫХ ЧАРАДЗЕЯЎ

Хто такі сапраўдны чараўнік і як ім стаць, на беларускамоўным уроку пазакласнага чытання «Школа добрых чарадзеяў» высвятлілі вучні 4 «А» класа сярэдняй школы №189 г. Мінска.

Пяць нефармальных міні-заняткаў у межах праекта «Ад культуры чытання — да культуры асобы» правяла студэнтка 3-га курса факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Ганна Баранава. Запрошаны ў «Школу добрых чарадзеяў» **старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, пісьменнік і паэт Міхась ПАЗНЯКОЎ** з задавальненнем слухаў, як на «Уроку сямейнай цеплыні» дзеці складалі пераблытаныя літаратурныя радкі ў яго вершы, чыталі іх на памяць, адгадвалі загадкі. Гулялі ў літаратурнае фоталато на «Уроку адчування прыгажосці прыроды», падбіраючы пад малюнак адпаведны верш. І нават здавалі творчы экзамен, разважаючы, пра што хацеў сказаць у сваіх творах Міхась Пазнякоў.

— Вы — мае настаўнікі, бо я вучуся ў вас пісаць сапраўднае і патрэбнае вам. Каб кніга была цікавай, трэба сапраўды быць чараўніком, — сказаў літаратар вучням. — У адной з кніг, якія вы прачытаеце, абавязкова аднойчы знойдзецца залаты ключык, схаваны між старонак. Вы адразу зразумееце, калі гэта адбудзецца, бо ён зазвініць галасамі людзей, якія будуць вас хваліць за кемлівасць, спагаду, выхаванне і дабрыню.



Вучні падарылі пісьменніку букеты папяровых рамонкаў, на пялёстках якіх напісалі назвы ўпадабаных імі твораў. Ды і сам Міхась Пазнякоў завітаў на ўрок не з пустымі рукамі.

— Скіравалі ўвагу на дзіцячую кнігу, бо менавіта ў малодшым школьным узросце пачынаецца фарміраванне сапраўднага паўнавартаснага чытача. Калі страціць гэты перыяд, то пазней цікавасць да чытання можа ўвогуле не з'явіцца, — лічыць **Наталля ЖДАНОВІЧ, дэкан факультэта пачатковай адукацыі БДПУ**.

— Мы таксама маем на мэце навучыць будучых настаўнікаў нестандартна ставіцца да ўрока літаратурнага чытання. Хочам, каб яны выйшлі за межы падручніка і прывілі дзецям любоў да кнігі, навучылі, — патлумачыла сутнасць ідэі **Ірына БУТОРЫНА, старшы выкладчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ, метадыст аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі**. *— Хочацца, каб на гэтых уроках больш глыбока асэнсоўваліся творы дзіцячай літаратуры, каб малым захацелася схадзіць у бібліятэку, прачытаць новае апавяданне, казку.*

Заданні настаўніка абмяркоўваліся ў групах, так што незвычайны ўрок ператварыўся ў сапраўдныя спаборніцтвы, быццам у гульні «Брэйн рынг».

У межах праекта будучыя настаўнікі праводзяць творчыя ўрокі пазакласнага чытання ў розных школах сталіцы (кожны раз запрашаючы на іх аднаго з дзіцячых пісьменнікаў), а на канікулах — у летніках. У той жа час самі студэнты атрымліваюць майстар-класы ад беларускіх пісьменнікаў і педагогаў з вопытам. Адным з практычных вынікаў працы стане стварэнне метадычных дапаможнікаў, якія стануць карыснай падтрымкай для настаўнікаў.

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

■

■ Выпрабавана на сабе

АДШУКАЦЬ ДРУГУЮ ПАЛАВІНКУ. ХУТКА

Прызнаюся шчыра: да «хуткіх спатканняў» я ставілася досыць скептычна. У штучна створаных умовах збіраюцца людзі (няўжо нельга пазнаёміцца як-небудзь інакш?) і спрабуюць зразумець за лічаныя гадзіны, ці падыходзіць ім той ці іншы чалавек. Навошта? Я не раз чула гісторыі, як знаёміліся ў метро, на днях народзінаў, нават у інтэрнэце, і пасля браліся шлюбам і жылі доўга і шчасліва. Але каб на хуткіх спатканнях... У працяг нашай гутаркі з Аксанай Чырко, мінскай сваццяй («Сямейная газета» за 28.04.2016), мы наведалі адну з такіх сустрэч, якую яна арганізоўвае штомесяц, і паспрабавалі вызначыць, ці сапраўды такім шляхам можна адшукаць «свайго» чалавека.

КРОК ПЕРШЫ: ПАДРЫХТОЎКА

Я ўпэўнівала сябе, што гэта па працы і напружвацца не варта. Але нядзельны час, скрадзены ў праполкі градак на бацькоўскім лецішчы, усё адно трэба было скарыстаць. Таму зборы — хаджэнні па ўсіх кругах перадспаткальнага «пекла» — пачаліся ўжо за тры гадзіны. За гэты час я адчула сябе галоўнай гераіняй кліпа «Экспанат» групоўкі «Ленінград», які абляцеў інтэрнэт-прастору ў апошнія месяцы. Прычоска, манікюр (якому звычайна ўвагі надаецца найменш), макіяж... Праўда, шукаць лабутэны мне не прыйшлося: што надзець і абуць, прыдумала загадзя.

КРОК ДРУГІ: ЛАМАННЕ СТЭРЭАТЫПА

Мне заўжды падавалася, што на хуткія спатканні прыходзяць тыя, у каго ёсць пэўныя перашкоды ці праблемы ў зносінах з супрацьлеглым полам. Але гэтае ўяўленне не спрацавала. Я спецыяльна прыйшла загадзя і з цікавасцю разглядзела ўдзельнікаў. Відавочна, што ў большасці з іх не было тых трох вольных гадзін на малапатрэбную падрыхтоўку, як у мяне. Бо на сустрэчу, па-першае, прыйшлі людзі, у якіх складваецца паспяховая кар'ера і ім нязвыкла сядзець на месцы, і, па-другое, гэта тыя, хто не толькі добра працуе, але і на шырокую нагу адпачывае. Напрыклад, Канстанцін, які займае кіраўнічую пасаду, у сезон катаецца з альпійскіх вяршыняў на лыжах і сноўбордзе, у міжсезонне — у Мінску на каньках. Лізавета, якая займаецца продажамі, — гурманка, для яе згатаваць суп гаспача, ялавічыну па-бургундску ці мексіканскае бурыта — звычайная справа. Большасць удзельнікаў даязджалі на спатканні на працягу гадзіны ад пачатку, бо былі занятыя па працы ці актыўна адпачывалі.

На мерапрыемства прыйшлі тыя, хто відавочна шукаў не хуткую інтрыжку, а партнёра для будучых адносін. Таму мужчыны адкрыта пыталіся пра погляды на стварэнне сям'і.

На сустрэчу ў выніку прыйшло 12 чалавек (6 жанчын і столькі ж мужчын). Трэба адзначыць, што ўсе яны былі відавочна старэйшыя за мяне і, мабыць, сярэдні ўзрост складаў гадоў 28-30. Прычым жанчыны — розных прафесій, але ўсе як адна прывабныя і, што самае галоўнае, цікавыя ды разумныя. Мужчыны адрозніваліся значна больш — завіталі і дызайнеры, і журналісты, і бізнесмены, і праграмісты, — былі старэйшымі за жанчын-удзельніц.

КРОК ТРЭЦІ: НЕПАСРЭДНА ЗНАЁМСТВА

У памяшканні было расстаўлена шэсць столікаў з двума крэсламі кожны. За столікам — пара з мужчыны і жанчыны. Першае наша заданне было паспрабаваць адгадаць, якія ў твайго візаві прафесія, характар, любімая страва, колькі сясцёр і братоў. Вядома, што адгадваць не надта атрымлівалася, таму суразмоўцу, як і мне самой, даводзілася расказваць пра сябе. Дарэчы, 4 з 6 сказалі, што я — настаўніца малодшых класаў. Прыкладна кожныя 15 хвілін мужчыны пераходзілі да наступнага століка, за мой садзіўся іншы чалавек, і мы пачыналі гутарку наноў.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Тут сабраліся людзі, у якіх, па-першае, складваецца паспяховая кар'ера і ім нязвыкла сядзець на месцы, і, па-другое, гэта тыя, хто не толькі добра працуе, але і на шырокую нагу адпачывае.

Гэтак прайшло першае кола. Аказалася, што сядзець і ўважліва слухаць недастаткова. Мне, з любоўю да тэатра, чытання і вырошчвання кветак на лецішчы, было цяжка «супасці» з аматарамі экстрэмальных відаў спорту, атэістамі ці тымі, хто верыць у тэорыі агульнага Бога і касмічных духоўных хваляў. Тым не менш былі і калегі, выпускнікі Інстытута журналістыкі, з якімі агульных тэм для размоў знайшлося як расы. На наступным «коле», калі ізноў за мой столік сеў першы суразмоўца, мы гутарылі, толькі ўжо тэматычна, а на апошнім — на любую вольную тэму. Напрыканцы, калі ўжо пайшла чацвёртая гадзіна сустрэчы, мы пачалі гуляць у штосьці накшталт кракадзіла. Па словах свацці, характар сустрэчы (больш гутарак ці больш гульняў) залежыць ад таго, якія ўдзельнікі падабраліся. У нашым выпадку — досыць сталыя і сур'ёзныя. Таму акцэнт быў зроблены менавіта на размовы.

ЗАМЕСТ ПАСТСКРЫПТУМА

Магу сказаць адно: час я правяла прыемна. На мерапрыемства прыйшлі тыя, хто відавочна шукаў не хуткую інтрыжку, а партнёра для будучых адносін. Таму мужчыны адкрыта пыталіся пра погляды на стварэнне сям'і. Вернікі — пра Бога, правыя — пра палітычныя погляды, калегі — пра тое, як пажываюць у інстытуце выкладчыкі, некаторыя ўдзельнікі — нават пра тое, як я стаўлюся да інтымных зносін... Склалася адчуванне, што цябе акуратна «мацалі» на погляды, інтарэсы і каштоўнасці і спрабавалі адшукаць тое агульнае, што дапаможа завязаць будучыя адносіны. Але ўзроставая розніца была занадта адчувальнай, таму, без асаблівага разліку на будучыню, я атрымлівала асалоду ад размоў тут і цяпер.

Напрыканцы сустрэчы кожны з удзельнікаў аддаваў свацці картку сімпатый, у якой насупраць кожнага імя мужчыны ці жанчыны можна было паставіць адну з адзнак — сэрцайка (значыць, ён спадабаўся і хочаш працягнуць адносіны) ці смайлік (для сяброўства). У рамантычным плане мне спадабаўся толькі адзін з удзельнікаў, і адзін здаўся цікавым для сяброўства. Што тычыцца апошняга — мы супалі. Але з першым, на жаль, не. Па словах Аксаны Чырко, усяго адбылося пяць супадзенняў для будучых адносін, і чатыры — для сяброўства.

Самае галоўнае — дзякуючы спатканням мне давялося выйсці з зоны камфорту. Бо людзі, якія маюць па дзве вышэйшыя адукацыі, некалькі разоў за жыццё мянялі спецыяльнасць, прачыталі значна больш кніг, наведалі куды больш краін, нагадалі мне, што выйсці замуж, гэта, вядома, важна. Але наперадзе столькі нязведанага і цікавага... нашто спяшацца?

Вераніка ПУСТАВІТ.

pustavit@zviazda.by

Імёны ўсіх удзельнікаў хуткіх спатканняў зменены

■ Вазьму твой боль...

ЖЫЦЦЁ ПІША НАЙЛЕПШЫ СЦЭНАРЫЙ

Мы самі любім ствараць ілюзіі. Верым у тое, у што хочам верыць. І адмаўляемся ведаць тое, што і без таго ведаем. Мы закладнікі ўласных поглядаў і жаданняў.

Аднойчы, распытваючы пра дзейнасць дабрачыннага «Клуба 5000», журналістка папрасіла мяне: «Чытала, што вы былі сведкай некаторых гісторый кахання паміж падлеткамі ў анкацэнтры. Раскажыце пра іх». Ёй вельмі хацелася пачуць прыгожы расповед пра рамантычныя пачуцці, здольныя змяніць нязменнае. Мне таксама хацелася падзяліцца такой гісторыяй. Вельмі хацелася. Але я набралася мужнасці і адмовілася. Бо ў рэальнасці гэта сумныя гісторыі. З такімі ж бытавымі праблемамі, як у нас з вамі, з такімі ж сваркамі, ахвярамі, з такімі ж інтрыгамі і расчараваннямі. Толькі з іншым фіналам. Часта банальна прадказальным. Там кропка канчатковая. Пункт незвароту. Сапраўдны канец.

Мы рамантызуем такія гісторыі. Пісьменнікі аздабляюць іх, прыфарбоўваюць. І незаўважна звычайная гісторыя адносін пераўтвараецца ў размаляваную слязлівую аповесць, дапаможнік для ўсіх закаханых.

Мы, журналісты, таксама грашым схільнасцю прыхарошваць рэчаіснасць. Нам здаецца, што парачка штучных зялёных лісточкаў не зменіць сутнасці, але надасць сакавітасці. Пары лісткоў аказваецца недастаткова — далучаюцца цэлыя галіны, дадаюцца пластыкавыя кветкі, складаюцца штучныя букеты. І мы аздабляем, адразаем лішняе, падганяем па форме, упісваем у каноны.

У клубе была падапечная, прыгожая маладая дзяўчына. Хвароба прынесла ёй шмат пакут. Паказала несправядлівасць, нявернасць, чалавечую гнілату. Крыўды, расчараванні. Найлепшыя кавалеры, з-за якіх ёй зайздросцілі іншыя дзяўчаты, раптам адвярнуліся. Алена разгубілася і больш не разумела, каму патрэбная, а для каго цяпер няважная.

І тут пад шумок з'явіўся ён. Не, не прынц, зусім не прынц. Звычайны вясковы хлопец. Пры іншых абставінах яна, прыгажуня, і не зірнула б на яго. А тут перагледзела свае прыярытэты, ацаніла клопат. Адказала на рамантычную прапанову і, не адкладаючы, пачала збірацца замуж.

Прыгожую гісторыю кахання цяжка хворай дзяўчыны і адданага хлопца падхапілі СМІ. Людзі натхняліся, дзякавалі, зычылі маладым шчасця.

Толькі за кадрам засталося тое, што клапатлівы малады дужа піў і часта сварыўся са сваёй прыгажуняй, моцна засмучаў яе. У агульнай замілаванасці ніхто не звярнуў увагі і на юнацкі Аленін адчай. Ёй вельмі хацелася кахаць і быць каханай. Ёй даводзілася прызвычайвацца да новых умоў і абмежаванняў. Яна адчайна шукала паветра, пачуццяў, разумення. Хоць заўсёды з аптымізмам глядзела ў будучыню, думаю, падсвядома, яна баялася не паспець. Таму спяшалася. І таму заплюшчвала вочы на гарэлку, безадказнасць і абразы.

Гэты абзац не ўпісваецца ў канцэпцыю бездакорнай гісторыі кахання. Мы скарацілі яго, выкінулі, не заўважылі, выкраслілі з памяці і сцёрлі з гісторыі. Мы робім так з усім, што не ўпісваецца ў рамкі, намі ж самімі і створаныя.

Часам едзеш на інтэрв'ю з ужо падрыхтаванай схемай эфірнага сюжэта. Так ты пачнеш, потым дасі сінхрон, далей падводку да праблемы, у гэтым месцы герой павінен расказаць пра гэта, а ў наступным — пра тое. Прыязджаеш, пачынаеш гутарку — і ўсе твае планы разбураюцца, як картачны дамок. Суразмоўца выходзіць на такія аспекты тэмы, на такія эмоцыі і развагі, пра якія ты нават не падазраваў. Ён не ўпісваецца ў тваю канцэпцыю. Ды і канцэпцыі больш няма. Ты разумееш, што жыццё піша найлепшыя сцэнарыі.

Я люблю дакументальныя фільмы Андрэя Куцілы. Там кожная сцэна пастаўлена жыццём. Пастаўлена бездакорна. Ты акунаешся ў яе і разумееш, што ніводзін рэжысёр, нават самы выдатны, не даб'ецца ад самага таленавітага акцёра такога моманту. Ніводны залатарукі дэкаратар не зробіць такой карцінкі, як само жыццё. Толькі не стварайце яму рамкі, не абмяжоўвайце канцэпцыямі. Проста назірайце і фіксуйце. Жыццё не падуладнае нам, не падладжваецца пад нашы патрэбы. Гэта мы падпарадкоўваемся яму. І калі скарыцца, даверыцца і прыняць гэта, то ўпісацца ў яго даволі проста.

Што да герояў гісторыі кахання, яны не паспелі пажаніцца. Адданы жаніх і праз некалькі гадоў пасля страты Алены абражае тых, хто захоўвае яе памяць. А па інтэрнэце гуляе крынальны сюжэт пра тое, як дзіўнай прыгажосці смяротна хворая дзяўчына і клапатлівы хлопец з дапамогай кахання пераадольвалі наканаванае.

Таццяна НЕМЧАНІНАВА,
заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»

МОЙ ВЕЛІСТРУХЕН З'ЕЛА МОЛЬ

Новы год — 2016: у стылі сюррэалізму.

«Аня малявала гусей, а я пачаў нешта раіць»

— У вас, я гляджу, патрыярхат. На сценах толькі карціны Васіля...

В.: Толькі ў гэтым пакоі *(усміхаецца)*. Калі завітаеце ў спальню, пакой Машы — убачыце выключна Аніны работы.

Г.: Доўгі час у нас у кватэры карцін не было зусім. Прынцыпова не развешвалі. Каб не было такога, што прыходзіш з майстэрні — а дома ўсё тое ж самае. Пачалося з таго, што Маша папрасіла павесіць у яе пакоі маю карціну...

М.: З дзяўчынкай з рудымі валасамі і зайцам.

Г.: Яна на той момант была прададзена. Таму павесілі іншую — з совамі. А дзе адна карціна — там і дзве...

В.: Цяпер мне нават падабаецца. Ляжу на канапе і на вёску сваю гляджу. Там я ў дзяцінстве кожнае лета праводзіў. І зараз ахвотна туды ездзім, у госці да майго дзядулі, яму 87.

М.: Зараз там няма чаго рабіць. Адзін сабака памёр. Другога — аддалі. Ніякіх жывёл няма, акрамя курэй. А яны ўцякаюць. Іх нават не абдымеш.

— Аня, Васіль, наколькі ведаю, вы пазнаёміліся падчас вучобы ў Акадэміі мастацтваў. Гэта было каханне з першага позірку?

В.: Не. Я адчуў, што Аня «мой чалавек» недзе праз паўгода. Памятаю, калі ўпершыню звярнуў на яе ўвагу. Аня пісала кампазіцыю. Я падышоў, пачаў нешта раіць. Я быў крыху старэйшы, паступіў у Акадэмію пасля мастацкага вучылішча, якое скончыў з чырвоным дыпломам. Яна паківала галавой і зрабіла па-свойму. Як заўсёды *(смяюцца)*.

— А памятаеце, што Аня малявала ў той момант?

В.: Там быў вясковы матыў, што мяне, дарэчы, і прыцягнула. Бялізна, якая развівалася на ветры, а побач жанчына гнала гусей.

Г.: А я ніколі не забудуся на нашыя першыя зімовыя канікулы. Паехалі з Васем у Гомель. Тады я ўпершыню ў жыцці схадзіла з ім на зімнія эцюды. Змерзла жудасна. Азяблымі рукамі штосьці намалявала. І пасля скакала вакол Васі: «Пайшлі хутчэй у кавярню, грэцца». А ён: «Пачакай, я яшчэ крыху памалюю».

В.: Я тады намаляваў карціну 60х40. Палац Паскевічаў.

Г.: Такая вось рамантычная прагулка. Больш я такія запрашэнні не прымаю *(смяецца)*.

В.: Але ж гарбатай я цябе ўсё ж такі напаіў тады.

— Кажуць, галоўнае для дзяўчыны паспяхова выйсці замуж. Пад «паспяхова» ўсе разумеюць, як правіла, каб у мужа была кватэра, машына... А для вас, Аня, што значыць паспяхова выйсці замуж?

Г.: Я выйшла замуж у 21 год. Прайшло 14 гадоў, і я па-ранейшаму задаволена сваім выбарам. Многія лічаць, што мець мужа-мастака не вельмі добра. Лепш бізнесмена, каб шмат грошай у сям'ю прыносіў. Для мяне важна, каб былі агульныя інтарэсы, каб чалавеку, які побач, было цікава, чым я займаюся.

«Аднакласнікі зайздросцяць, што ў мяне бацькі — мастакі»

— А ты, Маша, як лічыш, пашанцавала табе з бацькамі?

М.: У школе ўсе зайздросцяць, што ў мяне бацькі — мастакі. Калі трэба плакат намаляваць, то адразу мне даручаюць. Маўляў, у мамы ці таты спытаеш, як зрабіць. Я таксама спрабую маляваць. Не заўсёды, канешне, хочацца. Але добра, калі ёсць хтосьці, хто параду дасць.

— Бачыла ў «Фэйсбуку», што ты сваю першую карціну прадала не так даўно?

М.: Нядаўна ў Палацы мастацтваў была лялечная выстава. Там былі мамины, татавы і мае работы. Падышла цёця і купіла ў мяне адну карціну. А пасля яна знайшла мяне ў інтэрнэце. Напісала, што карціна спадабалася дачцэ. І што заўтра падыдзе і купіць яшчэ адну.

— Што ты адчувала ў той момант?

М.: Мне, канешне, было шкада карцін. Бо не хочацца расставацца. Але ж засталіся фотаздымкі.

Хацелася б вялікую майстэрню-галерэю-студыю. Каб людзі, якія ішлі міма, маглі б зайсці ў госці, паглядзець новыя работы, папіць гарбаты і пагутарыць. Ну і каб там можна было праводзіць розныя цікавыя майстар-класы.

— Маша, твае работы больш падобныя на маміны, чым на татавы...

Г.: Гэта проста ад таго, што я з ёй займаюся. Вася не можа адначасова і працаваць, і парады даваць. Пару разоў яны з Машай на эцюды хадзілі, але гэта звычайна закачваецца аднолькава. Спачатку спрабуе ўдзельнічаць, а пасля акунаецца ў сваю работу і ўсё...

В.: У нас так: сюжэт Анін, а тэхніка мая. Маша любіць з цюбіка шмат фарбы выціснуць. Можа, проста не ведае, колькі яна каштуе *(смяюцца)*. Раней, калі Машы было 3 годзікі, я ёй даваў палатно, фарбы. Яна фон рабіла. Я ж пасля дапрацоўваў. А неяк было так, што я пісаў вялікую работу — макі. Даў ёй пэндзлік: «На, ты паспрабуй». Яна ўзяла яркую фіялетавую фарбу і раз-раз мазнула. Гляджу, якраз гэтага колеру і не хапала. І дарабляў фіялетавым. Атрымалася вельмі ўдала.

— Маша, раней ты казала, што ў цябе зацякае рука, калі малюеш, таму ты ніколі не будзеш мастаком. Прайшоў не адзін год. А ты працягваеш маляваць...

Марыя Васілеўна ўпершыню прадала сваю карціну! На заднім плане работы Ганны Сілівончык.

В.: Мама прымушае. Часам нічога не застаецца, як браць за шкірку і цягнуць у майстэрню.

М.: Гэта вобразна *(смяюцца)*.

В.: Даводзіцца неяк матываваць. Аня плаціць 100 тысяч за кожную закончаную карціну.

Г.: Я з Машай стала сур'ёзна займацца толькі год таму. Доўга чакала, што ў яе прарэжацца да чаго-небудзь ярка выражаны інтарэс. Не дачакалася. Думаю, а раптам гэтага і не здарыцца, калі столькі спакус вакол...

— Вам бы хацелася, каб дачка пайшла па вашых слядах, стала мастачкай?

Г.: Не магу сказаць, што вельмі гэтага хачу. Проста гэта адзінае, чаму я яе сама магу навучыць. Тым больш бачу, што здольнасці ёсць, чаму б іх не развіваць. Лічу, гэта няблага, як адзін з кірункаў развіцця. Маша ж яшчэ займаецца ў тэатральнай студыі.

«Дагэтуль часам з Васем размаўляем на Машынай мове»

— Учора перад сном паглядзела ваш спектакль пра конікаў, у якіх ад кахання выраслі крылы (відэа глядзіце на сайце «Звязды». — Аўт). І запісалася ў ваш фан-клуб. А чаму свой сямейны тэатр ценяў назвалі «Веліструхен»? Што гэта за слова такое?

М.: Наогул, няма такога слова. Я глядзела мульцік. Там была песня. Я няправільна зразумела сэнс. Бегала па кватэры і спявала: «Мой Веліструхен з'ела моль». А там быў смокінг наогул. Проста пераблытала словы. Маме з татам вельмі спадабалася. І яны хацелі назваць гэтым словам што-небудзь. А пасля, калі думалі, як назваць сямейны тэатр ценяў, узгадалі гэта слова і назвалі яго так.

Г.: «Веліструхен» — гэта сімвал спантаннай творчасці. Дзеці вельмі часта несвядома прыдумляюць наватворы. Маша ў дзяцінстве нейкія словы перайначвала, перакручвала. У нас іх цэлая калекцыя. Дагэтуль часам з Васем размаўляем на Машынай дзіцячай мове.

В.: Ідзі, прынясі «хахоні» — шкарпэткі, «какокі» — калготкі, «камкана» — смятана...

— Наколькі важна, каб у сям'і было агульнае захапленне?

Г.: Гэта яднае. Сямейнае хобі з'явілася, у першую чаргу, дзеля Машы. У яе з дзяцінства інтарэс да кіно. Але паколькі фільм здымаць у хатніх умовах складана, прыдумалі хатні тэатр. Каб развіць Машыны здольнасці і адцягнуць яе ўвагу ад камп'ютара, дурацкіх мульцікаў.

В.: У нас ролі размеркаваныя. Маша агучвае.

Г.: А мы з Васем кіруем лялькамі. У асноўным спектаклі ставім па маіх казках. Адзін — па Машынай зрабілі. Я яе крыху адаптавала пад тэатр ценяў. Лялькі таксама, у асноўным, раблю я. З задавальненнем паказваем свае міні-спектаклі сваім сябрам у майстэрні ці дома. Калі запрашаюць, і іншым дзеткам.

— Як любіце бавіць час сям'ёй?

Г.: Любім вандраваць.

М.: А на Новы год у нас збіраюцца маміны і татавы сябры з дзецьмі. Мама прыдумвае асобую тэматыку: напрыклад, чараўнікі, Індыя. Кожны з гасцей рыхтуе конкурс, прыз. Да ранку не спім, гуляем, танцуем. Вельмі весела. Таму маё любімае свята Новы год.

«Іду зялёная па вуліцы — а ўсе азіраюцца»

— Вы ўсе разам працуеце ў майстэрні?

В.: Наша майстэрня — самая звычайная двухпакаёвая кватэра. Яна тут, непадалёку. У адным пакоі Аня працуе...

М.: Са мной.

В.: А ў другім — я.

Г.: У Васі пакой большы. Ён выстаўляе нацюрморты. І акно яму большае патрэбна для асвятлення.

М.: А хутка, калі мы пераедзем, у мяне будзе свая майстэрня.

В.: Мы прадалі гэту кватэру і майстэрню. Неўзабаве пераедзем з Каменнай Горкі ў цэнтр горада — на Веры Харужай. У новай кватэры мы вырашылі адзін пакой выдзеліць пад дамашнюю майстэрню. Бо Машы пасля школы...

М.: Мне часам проста не хочацца ісці ў майстэрню, таму што я вельмі брудная, калі малюю. Твар, ногі — усё зялёнае. У майстэрні няма ванны, толькі ўмывальнік маленькі. Там моцна не адмыешся. Таму я з зялёнымі рукамі, нагамі, тварам вымушана вяртацца дадому — а ўсе азіраюцца.

В.: Не разумею, чаму ты так выпэцквaешся...

М.: Я проста вельмі актыўна і прыгожа малюю!

— Чаму вырашылі пераехаць жыць у цэнтр горада?

В.: Гэта Аніна мара.

Г.: Мы любім хадзіць на выставы. Яны ж усе ў цэнтры горада. А з Каменнай Горкі пакуль дабярэшся... Часу шкада на дарогу.

— Мо марыце пра сямейную галерэю?

Г.: Хацелася б вялікую майстэрню-галерэю-студыю. Каб людзі, якія ішлі міма, маглі б зайсці ў госці, паглядзець новыя работы, папіць гарбаты і пагутарыць. Ну і каб там можна было праводзіць розныя цікавыя майстар-класы, сустрэчы, спектаклі. Але ж гэта не так проста арганізаваць. Як падумаю, што трэба будзе на адміністрацыйныя справы страчваць свой час, які хацелася б удзяляць творчасці...

«Я не так сур'ёзна выглядаю, як хацелася б маёй маме»

— Ганна, мяркуючы па вашых карцінах, вы вельмі свабадалюбівы чалавек. Наколькі важна для вас свабода ўзаемаадносін у сям'і?

Г.: Пасля акадэміі я нікуды не пайшла працаваць, бо для мяне было вельмі важна, каб не было нада мной начальніка, які б мне ўказваў, што і як маляваць. І ў сям'і важна ўлічваць інтарэсы кожнага. Вася ездзіць на пленэры, мне ў галаву не прыйдзе яго абмяжоўваць: «Сядзі дома. Навошта табе гэта?» Тое ж самае і ён: дапамагае мне з выставамі, праектамі. Машыны жаданні, калі яны не зусім вар'яцкія, стараюся дапамагчы ажыццявіць.

М.: Я хацела сабе ў новай кватэры чорныя шпалеры. Цалкам чорны пакой. А тата супраць.

Г.: Вася не любіць цёмныя колеры ў інтэр'еры. Але хоча чалавек, што тут такога. У выніку мы прыйшлі да кампрамісу: дзве сцяны зрабілі чорнымі, дзве — блакітнымі.

— Ганна, Васіль, якімі вы сябе ўяўляеце ў старасці? Такімі, як на адной карціне Сілівончык, дзе пажылая парачка едзе на матацыкле. Ці іншымі?

Г.: Мне больш імпануюць бабулі і дзядулі, якія вандруюць, чым тыя, што толькі ў градках сядзяць ці дома на канапе з газетай. Я гляджу на сваіх бацькоў. Ёсць грошы, магчымасць некуды паехаць, але тата мой ні разу не быў за мяжой. І яму нават не хочацца. У любым узросце трэба старацца атрымліваць ад жыцця задавальненне, тады і людзям будзе добра побач з вамі.

Вася ездзіць на пленэры, мне ў галаву не прыйдзе яго абмяжоўваць: «Сядзі дома. Навошта табе гэта?»

— І будзеце апранацца гэтак жа ярка, як цяпер?

В.: Аня — будзе. Часам бачу якую-небудзь бабулю з рудымі валасамі і сінімі ценямі, якая прытанцоўвае. «О, — кажу Ані, — гэта ты ў будучыні». Я ж буду спакойны, больш класічны.

— А бацькі як ставяцца да вашай творчасці, ладу жыцця?

Г.: Мама мая адзін час перажывала, што мы нідзе не працуем афіцыйна. «А як жа пенсія?» Ёй складана гэта зразумець, яна ж усё жыццё прапрацавала дзяржслужачай, займала кіруючыя пасады. Доўгі час нават у адпачынак не хадзіла. А пасля зразумела, што і так можна нармальна жыць. Цяпер дабралася да інтэрнэту, сацыяльных сетак. Перажывае, калі нехта дрэнны каментарый пакіне на маёй старонцы. А нядаўна ўбачыла мяне на прэзентацыі ў фіялетавых калготках. «Ты ўжо не ў тым узросце, кажа, калі можна надзяваць такія рэчы. Пойдзем купім прыстойны касцюм, туфлі на абцасе». Можа быць, я не так сур'ёзна выглядаю, як хацелася б маёй маме. Але я такая, і мне гэта падабаецца.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота Надзеі БУЖАН
і з сямейнага архіва герояў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

■ Стыль жыцця

«МАРУ ЗАХАПІЦЬ СВАІХ ДЗЯЦЕЙ ПАДАРОЖЖАМІ»

Чалавек — гэта брыльянт, таму ён павінен быць шматгранным. Менавіта такім жыццёвым крэда кіруецца Ганна БЯЛЯК. За свае 24 гады дзяўчына вывучылася на інжынера-праекціроўшчыка метрапалітэнаў, выйшла замуж, з'ездзіла аўтастопам у Польшчу і прайшла турыстычныя інструктарскія курсы. Ганна не можа ўявіць сваё жыццё без яркіх фотаздымкаў, самаробнай выпечкі і танцаў. Калегі дзівяцца з маладзіцы: яна прыязджае на працу на ровары. Хтосьці бавіць вольны час перад тэлевізарам, а Ганна бярэ заплечнік і ідзе па балотах. Але яе самы непрадказальны ўчынак — паход па гарах Цэнтральнай Каталоніі.

— Усё пачалося з сяброў, якія шмат падарожнічаюць. Яны расказвалі цікавыя гісторыі з вандровак, а я імі захаплялася. Мне заўсёды здавалася, што гэта не для мяне. Лічыла, што трэба валодаць жалезнай сілай волі і неверагоднымі фізічнымі здольнасцямі. Аднойчы знаёмы запрасіў мяне ў паход у Радашковічы. Там я і пазнаёмілася з інструктарам, які прапанаваў мне вандроўку ў Іспанію.

Ганну з дзяцінства прыцягвала ўсё новае, нязведанае. Самы лепшы падарунак у жыцці — гэта калекцыя кніг «Я спазнаю свет» ад бацькоў. Найбольш пашарпанымі чамусьці аказаліся кнігі па гісторыі і геаграфіі.

Над прапановай інструктара дзяўчына думала нядоўга. — Сябры дапамаглі мне з каскай, турыстычным заплечнікам, палкамі для хадзьбы, спальнікам, — кажа Ганна. — Я паклала ў заплечнік бутэльку пітной вады, запалкі ў цэлафанавым пакеце (каб не адсырэлі), запасны абутак, шкарпэткі і майкі, аптэчку, ежу. Нават захапіла «451 градус па Фарэнгейце», але мяне хапіла толькі на 15 старонак. Астатняе дачытвала дома. Спадзяюся, Рэй Брэдберы не пакрыўдзіўся. У выніку — 20-кілаграмовы заплечнік! Я прыйшла з працы, запляла свае фірмовыя касічкі, надзела шапку і паехала на вакзал. Там я і сустрэлася з калегамі па паходзе: інструктарам, жанчынай гадоў сарака пяці, хлопцам і дзяўчынай майго ўзросту.

Такі паход па кішэні кожнаму сярэднестатыстычнаму беларусу. Галоўнае — віза, якая абыдзецца прыкладна ў 80 еўра. Большасць сродкаў ідзе на пералёт і правоз багажу. Спаць даводзілася ў палатках.

— Знаёмыя паставіліся да майго падарожжа па-рознаму, — дзеліцца Ганна. — Сяброўкі падзяляюць маё захапленне. Нядаўна яны зрабілі мне цудоўны падарунак — сертыфікат на скаладром. А вось мужа, на жаль, не захапляюць мае інтарэсы. Калі мы браліся шлюбам, я паходамі не цікавілася. Цяпер ён у шоку (усміхаецца). Галоўнае для яго, каб я вярнулася здаровая і без траўмаў. Аднойчы падчас паходу маці даслала мне SMS са словамі «Дачушка, я вельмі ганаруся табою. Я ніколі не адважылася б на такое. Ты малайчына». Гэта былі вельмі прыемныя, натхняльныя словы.

Маршрут быў разлічаны на 12—14 дзён і складаў 120 кіламетраў. Лічба невялікая, але на самой справе ўлічваецца не ўвесь пройдзены кіламетраж, а толькі той, што з нейкімі перашкодамі. Першапачаткова вандроўнікі апынуліся ў Барселоне. «Там растуць мандарынавыя дрэвы! Вось людзі жывуць! — з захапленнем прыгадвае Ганна. — Я паспрабавала дольку — такая горкая аказалася. Гэта былі дэкаратыўныя мандарыны». Астатнія іспанскія гарады, у якія траплялі падарожнікі, былі вельмі малыя, з вузенькімі вулачкамі і старымі капліцамі. Прайсці іх можна за 10-15 хвілін.

Зразумела, што калі магу паўзці па гарах, то ў жыцці магу горы звярнуць.

На дзіва, з камунікацыяй праблем не ўзнікала. У Барселоне крыху ведалі англійскую мову і некалькі слоў па-руску. «Я ж на іспанскай гаварыла толькі два словы: hola (прывітанне) і gracias (дзякуй). Самая лепшая мова — мова жэстаў. Цікавы выпадак, калі нам з дзяўчынай захацелася паласавацца згушчонкай. Мы бегалі па краме са слоўнікам і дамагліся свайго. У гарах сустракаешся з падарожнікамі з розных куткоў свету. Не ведаючы мовы, мы разумелі адзін аднаго: хтосьці па плячы паляпае, хтосьці руку пацісне. Гэта падбадзёрвала».

— Уразіў характар мясцовых жыхароў. Ты сустракаеш людзей упершыню, але яны адкрытыя, шчырыя. Напрыклад, можна было пакінуць на падзарадцы тэлефоны ў кавярні і пайсці на паўтары гадзіны па сваіх справах. У крамах дазвалялі мыць садавіну. Гэта фантастычны народ.

У гарах надвор'е было непрадказальнае: тэмпература вагалася ад 12 градусаў удзень да мінус 2-3 ноччу, у перадапошні дзень пайшоў лівень, апошні дзень адзначыўся 15-сантыметровым слоем снегу. «Калі быў лівень, мы схаваліся ў прыгарадным муніцыпальным будынку, — распавядае Ганна. — Праз тры гадзіны да нас падышоў нейкі важны дзядзька і паказаў на выхад. Мы спачатку не маглі зразумець адзін аднаго. У выніку ён завёў нас у свой кабінет, адкрыў інтэрнэт і пачаў штосьці друкаваць па-іспанску. «Гугл» пераклаў — «Я мэр горада». Першая думка — што за лухта! Потым мы зразумелі, што знаходзімся ў будынку мэрыі. Калі мэр даведаўся, што мы падарожнічаем па іспанскіх гарах, ён завёў нас да дырэктара турыстычнага клуба. Той арганізаваў нам месцы для адпачынку на мяккіх спартыўных матах, дазволіў пакарыстацца душам і плітой. Ад грошай гаспадары катэгарычна адмовіліся».

На шляху адважных падарожнікаў былі і непрыемнасці, і нечаканыя радасці. Даводзілася лазіць уздоўж бездані па скалах, трываць жудасны боль ад крывавых мазалёў, пакутаваць ад бессані. Здавалася, яшчэ адзін крок — і ты не здолееш ісці. Але калі гэты крок рабіўся, быццам адкрывалася новае дыханне. Ганна ўсё жыццё баялася вышыні. Высветлілася, што гэта не так. Падарожнікі садзіліся на схіл і цешыліся краявідамі.

«У гарах я адчула сябе самым здаровым чалавекам: не балелі ні галава, ні сэрца. Я заўсёды знаходзілася ў руху, таму кроў рэгулярна абнаўлялася.

Дзяўчына заўсёды павінна быць моднай — такім прынцыпам кіравалася Ганна, калі збіралася ў паход. Яна зрабіла манікюр пад колер куртки. Інструктар быў вельмі здзіўлены: «Манікюр у паходзе? Ты адзіная такая на маёй памяці», — пракаментаваў ён. Як камічна гэта ні выглядала на пачатку, Ганна была адзіная, у каго не расслаіліся пазногці.

Ганна караскаецца па цясніне.

А яшчэ нашым спадарожнікам давялося есці іспанскія далікатэсы і прымаць душ у экстрэмальных умовах.

— Сухая і мяккая пасцель, чыстая вада, гарачы душ — усё гэта людзі пачынаюць цаніць у паходзе, — упэўнена Ганна. — Аднойчы мы купаліся пры тэмпературы два градусы. Гэтая працэдура суправаджалася віскам і крыкам, але я адчувала сябе ў той дзень духмянай ружай. Галаву памыла за ўвесь час два разы: у прыбіральнях сабора і кафэ. У кавярні ракавіна была ўдвая меншая за маю галаву».

Ежа ў паходзе здаецца ў сто разоў смачнейшай за дамашнюю. У нас было чатыры віды гарніру: аўсянка, грэчка, рыс і іспанская макарона. Гатавалі на газавых балонах. У паходзе я палюбіла малако. У гарах нават батон з чаем і рыбныя кансервы ідуць за мілую душу. Паспелі мы паласавацца і іспанскімі далікатэсамі. Такіх сакавітых апельсінаў я ў жыцці ніколі не каштавала. Здзівілі мяне і іспанскія перцы. Адзін перац разразалі на пяцярых, і кожны атрымліваў велізарны скрыль. А які чароўны смак у хамону (вяленага мяса) і іспанскага марозіва!

Сёння Ганна з усмешкай прыгадвае ўсе неверагодныя выпрабаванні, якія ўдалося пераадолець. Але ні пра што не шкадуе. Яе мара — захапіць сваіх дзяцей падарожжамі і хадзіць у паходы разам з імі. Засталося толькі з мужам дамовіцца. — Паход навучыў мяне з двух велізарных заплечнікаў рабіць адзін, — кажа Ганна. — А калі сур'ёзна, я стала ўпэўненай у сабе. Зразумела, што калі магу паўзці па гарах, то ў жыцці магу горы звярнуць.

Сябар падарыў Ганне на Новы год скрэтч-мапу. На ёй ужо закрэслены Беларусь, Польшча, Расія і Іспанія. Але спыняцца на гэтым дзяўчына не збіраецца. Наадварот — плануе размаляваць яе цалкам.

Застаецца пажадаць Ганне поспехаў у пераадоленні новых маршрутаў. Пасля нашай гутаркі я зразумела яшчэ адну рэч: з такімі адважнымі працаўнікамі трэцяя галіна метро будзе ўведзена своечасова.

Вераніка УЛАСЕВІЧ

■ Выбіраем адпачынак

СУНІЧНАЕ ЛЕТА... МОЖНА КУПІЦЬ

Лета — найлепшы час для аздараўлення і адпачынку дзіцяці. Добра, калі вы загадзя паклапаціліся пра тое, як правядзе канікулы ваш сын ці дачка. А калі не... Давайце разам шукаць варыянты дзіцячага адпачынку.

ПІКНІКОВЫ

Сітуацыя, калі няма бабуль, дачы і грошай на «марскую» пуцёўку, не тупіковая, упэўнена маладая мама Ірына Ваўчкова. Адпачынак з дзіцем яна праводзіць у горадзе: «Пакуль я была ў дэкрэце, летнія дзянькі мы бавілі ў парках. Малы купаўся ў фантанах, катаўся на атракцыёнах, мы наведвалі гарадскія фестывалі, музеі. Цяпер, калі я выйшла на працу, пікнікі ладзім па вечарах і ў выхадныя. Часам нас падбіраюць знаёмыя: пасля працы яны на машыне выязджаюць за горад — шашлык пасмажыць, пакупацца на возеры, парыбачыць».

ПАЗНАВАЛЬНЫ

Між іншым, з кожным годам для дзетак, якія вымушаны праводзіць канікулы ў горадзе, розныя камерцыйныя ўстановы прапануюць летнія адукацыйныя паслугі. Школьнікі могуць вывучаць замежныя мовы, праграмаванне, робататэхніку, ладзіць доследы. Разумныя заняткі есць нават для малых. Так, летам бацькам 4-6-гадовых дзетак школы ранняга развіцця прапануюць не толькі падрыхтоўку да школы, але і ўрокі малявання, акцёрскага майстэрства і... фізікі, геаграфіі, хіміі, анатоміі — вядома ж, у займальнай форме. Вось толькі часам уражвае кошт асобных прапаноў. Летняя навука для дзяцей у сталіцы можа каштаваць больш, чым адпачынак дзіцяці за такі ж час у аздараўленчым лагеры.

ПРЫГОДНІЦКІ

Адна справа — вучыцца ў горадзе, іншая — спасцігаць розныя навукі за яго межамі. Так, сёння многія летнікі таксама прапануюць школьнікам розныя пазнавальныя, адукацыйныя праграмы. І спасцігаць на канікулах можна не толькі замежную мову, але і мастацтва, гісторыю, вакал, плаванне, арыентаванне на мясцовасці, скалалазанне, альпінізм. «На лецішчы ў бабулі маёй дачцэ сумна, без сяброў яна там ледзьве вытрымлівае некалькі дзён. А як вяртаецца з летніка — у яе багата расповедаў. Важна толькі адказна падысці да пошуку аздараўленчага лагера, азнаёміцца з тым, якая там база, як падбіраюцца важатыя, што за праграма арганізоўваецца для дзяцей. Шукайце водгукі бацькоў, бо не факт, што ў дарагім летніку, дзе быццам арганізатарамі прадуманы ўсе дробязі, дзіцяці будзе добра», — упэўнена мінчанка Юлія Амельчанка. Сапраўды, сёння можна падабраць для дзяцей цудоўныя месцы адпачынку. У праграме асобных лагераў ёсць экскурсіі, наведванне аквапарка, лазертаг, спартыўныя і інтэлектуальныя спаборніцтвы, майстар-класы, трэнінгі, квесты, падарожжы, сплавы на плытах, катанне на квадрацыклах, катамаранах, рыцарскія турніры. У асобных ствараюцца нават тэматычныя праграмы: напрыклад, хлопчыкі могуць паспрабаваць сябе ў якасці лясных воінаў — яны будуць вучыцца страляць з лука, фехтаваць, засвояць асновы рукапашнага бою і сакрэты выжывання ў лесе.

Ёсць і такія летнікі, для якіх спецыяльна пішацца прыгодніцкі сцэнарый, рыхтуецца рэквізіт, задзейнічаны аніматары. Вось толькі арганізаваныя прыгоды часта каштуюць не менш, чым пуцёўка дзіцяці на мора.

Летнія аздараўленчыя лагеры могуць абысціся ў 2-8 мільёнаў, кошт залежыць ад колькасці дзён, умоў пражывання дзяцей і амбіцый арганізатараў.

Калі ваша дзіця наведвае гурткі ці спартыўныя секцыі, пацікаўцеся, ці не арганізоўваюць клубы і цэнтры дадатковай адукацыі летні адпачынак. Пра яго можна запытацца і ў грамадскіх арганізацыях. Напрыклад, беларускія скаўты кожнае лета збіраюць сваіх сяброў у палатачным лагеры.

МАРСКІ

Калі бацькі не могуць самі вывезці дзіця на мора — не бяда. Сёння турагенцтвы прапануюць арганізаваны дзіцячы адпачынак на марскіх курортах. Прычым тут для дзяўчатак і хлопчыкаў могуць таксама ладзіцца тэматычныя праграмы. Пляжны адпачынак дзіця можа сумясціць з заняткамі замежнай мовай, тэатральнымі рэпетыцыямі і вывучэннем традыцый пэўнай краіны. Часам арганізаваныя групы дзяцей на мора едуць з педагогамі ад спартыўных і танцавальных клубаў; можаце пацікавіцца, ці магчыма і вам туды ўладкаваць сваіх сыноў і дачок.

СУНІЧНЫ

Добра, калі можна выбрацца на лецішча ў суніцы і іншыя ягады з агарода, лесу. Але не трэба забывацца на гэты варыянт адпачынку, нават калі няма ўласнай дачы. Пры жаданні можна «купіць» сунічнае лета для дзіцяці — зняць дамок. І добра, калі пры ім яшчэ ёсць агародзік і сад, хаця б тыя ж кусты парэчак. Засяліцца можна як у старэнькую вясковую хату, так і ў абсталяваны катэдж — адсюль і вялікая розніца ў цэнах: ад 200 да тысячы (і болей) долараў за месяц.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БПХО»

№ п/п	Наименование лота	Местонахождение	Начальная цена продажи, с учетом НДС, руб.	Задаток 20%, руб.
1.	**Лот № 5 – капитальные строения: склад хлопка открытый с разгрузочной площадкой с инвентарным номером 110/С-102617, площадью 3253,0 кв.м;**	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7/5, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002576 площадью 0,3254 га	**1 367 388 000**	**273 477 600**
1.1	**железнодорожный путь № 4 с инвентарным номером 110/С-102752, протяженностью 137,8 м;**	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 14100000000600271, площадью 0,0472 га	**244 215 600**	**48 843 120**
1.2	**железнодорожный путь № 5 с инвентарным номером 110/С-102854, протяженностью 200,3 м**	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002619, площадью 0,0560 га	**351 632 400**	**70 326 480**
1.3	**Итого:**		**1 963 236 000**	**392 647 200**

Аукцион состоится 28 июня 2016 в 14.00 по адресу: 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 503, 5 этаж.

Организатор аукциона: открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО»), г. Барановичи, ул. Фабричная, 7.

Заявления и документы на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **24.06.2016**.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488.

Шаг торгов – 5 процентов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Сроки оплаты за предмет аукциона устанавливаются при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: (80163): 47-63-80 – главный инженер Сергеева Леся Ивановна, 47-64-93 – начальник ОКС Шамкуть Нина Михайловна.

29 июня 2016 г. **№6-С/2016**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Наличие ограничений	Целевое назначение	Начальная стоимость, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Затраты на подготовку документации, бел. руб.
1	ул. Ясная (между усадебными жилыми домами №56 и №60)	340100000004001368	0,0771	Охранные зоны линий связи и радиофикации	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	117 209 887	5 860 500	17 461 139
2	ул. Новобелицкая (в районе жилого дома № 6)	340100000007006530	0,1082	Ограничений нет		251 355 741	12 570 000	8 774 755
3	ул. Брянская (в районе жилого дома №148)	340100000002005706	0,1481	Охранная зона газораспределительной системы		515 764 174	25 800 000	22 863 838

1. **Организатор аукционных торгов – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).**

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.

3. **Аукцион состоится 29 июня 2016 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115** при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении, с отметкой банка, на **р/с 3012203080014 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, МФО 151501912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» по адресу г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае неподобы на аукционных торгах).

Необходимые документы:

4.1. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

4.2. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

4.3. представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

4.4. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору аукциона затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Если заявление на участие в аукционе подано только одним гражданином или юридическим лицом, земельный участок предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления с приложением необходимых документов для участия в аукционе принимаются Государсвенным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 26 мая по 27 июня 2016 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.**

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.30 до 14.50 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115.

КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН: **41-97-86.** Информация размещена на сайте: **www.gomel.gov.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 06 июня 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)				
№	Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов	Место-нахождение предмета торгов	Начальная цена предмета торгов без учета НДС, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1.	Торговое помещение общей площадью 21,7 кв.м, инв. номер в ЕГРНИ 500/D-708165507	г. Минск, ул. Немига, 30/1-1	1 073 200 000	100 000 000
2.	Помещение клуба общей площадью 636,6 кв.м, инв. номер в ЕГРНИ 500/D-708165508	г. Минск, ул. Немига, 30/1-2	17 837 200 000	1 000 000 000

Продавец имущества: МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч», ул. Короля, 2, АБК, каб. 415, 220004, г. Минск.

Организатор торгов: коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условия торгов:

победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

дальнейшее использование имущества осуществляется согласно генеральному плану г. Минска;

дальнейшее использование имущества осуществляется с учетом требований Закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь»;

при приобретении права собственности на предмет торгов (продаваемое имущество) покупатель обязуется на протяжении одного месяца подписать охранное обязательство в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь».

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **06 июня 2016 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 26.05.2016 по 02.06.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 200-12-65, 226-59-70 (МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч»).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 27 июня 2016 года в 10.00

по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.

Организатором аукциона является

республиканское унитарное предприятие «Отель «Минск»,

находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, д. 11, корп. 1, каб. 221.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

1. Помещение №210, арендуемой площадью 30,2 кв.м, на втором этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 026 800 рублей; размер задатка – 102 680 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 400 рублей.

2. Помещение №319, арендуемой площадью 21,7 кв.м, на третьем этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 737 800 рублей; размер задатка – 73 780 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 400 рублей.

3. Помещение №416, арендуемой площадью 72,7 кв.м, на четвертом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 2 471 800 рублей; размер задатка – 247 180 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 400 рублей.

4. Помещение №508, арендуемой площадью 31,8 кв.м, на пятом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 081 200 рублей; размер задатка – 108 120 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 400 рублей.

5. Часть лестничной клетки II, арендуемой площадью 10,0 кв.м, на первом этаже в изолированном помещении по просп. Независимости, 11, корп. 1-7 в г. Минске; начальная цена продажи – 340 000 рублей; размер задатка – 34 000 рублей; целевое использование – для размещения сотрудников компании-арендатора; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 400 рублей.

Документы на участие в аукционе принимаются с 26 мая 2016 года по 24 июня 2016 года с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232. Документы, поданные после 16.00 24 июня 2016 года, не рассматриваются.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

- перечисляет задаток на р/с №3012000006014 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;

- подает заявление на участие в аукционе;

- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

Порядок определения победителя аукциона:

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 15 000 000 рублей.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Телефоны для справок: (8-017) 209-90-93, (8-017) 209-92-78.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот №1. Капитальное строение (здание железобетонное) инв. №200/С-95909 общей площадью 92,3 м² стоимостью 1 014 400 000 белорусских рублей.** **Лот №2. Капитальное строение (проходная на автостоянке) с инв. №200/С-95910 общей площадью 4,8 м² стоимостью 12 800 000 белорусских рублей.**
Собственник (владелец) имущества	ОАО «ВИСТАН» (УНП 300029332)
Наличие обременений	Отсутствуют
Местонахождение (адрес) имущества	г. Витебск, ул. Димитрова, 36/25 и 36/28
Место (адрес), дата и время проведения торгов	08.06.2016 в 15.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витеблисполкома (г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10/1) www.vitebskjust.gov.by Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 614021, 8 (033) 6879148
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витеблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 07.06.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.

ПУЧОК ПЯТРУШКІ ЗАМЕСТ БУКЕТА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

У хуткім часе я зразумеў, што мае суседкі не асабліва падтрымліваюць маё захапленне, таму прапанаваў знаёмым разам арэндаваць жыллё і весці там экалагічны лад жыцця. Так з'явіўся эксперыментальны «Экалофт на Пятніцкай» — экакамуна, у якой я пражыў год (сам праект праіснаваў 2,5 года). Там мы запусцілі экашколу. Кожны чацвер у нашай гасцёўні праводзіліся дыскусіі на розныя тэмы: экатурызм, валанцёрства, асобны збор смецця. Людзей набівалася пад завязку.

— Як вы сталі трэнерам па экалагічна дружалюбным ладзе жыцця?

— Праз паўтара года існавання экалофта я звольніўся з кампаніі з марай пра сацыяльнае прадпрымальніцтва. Узнікла ідэя з кансалтынгам па зялёных офісах, мы запусцілі агенцтва GreenUp. Першы платны кліент у нас з'явіўся толькі праз тры гады. А першыя грошы на экалогіі я зарабіў сумесна з Аляксеем Шыршовым, сузаснавальнікам «Школы экарамонту і натуральнага будаўніцтва імя Тома Соера». Памятаю, як ён для тэлевізійнага сюжэта піў на камеру зялёную фарбу, зробленую з малака *(смяецца)*.

Трапіўшы на канферэнцыю па інфармацыйным бізнесе, я раптам зразумеў, што ўсе мае веды па экалогіі можна... манетызаваць. На радзіме, у Кузбасе, арганізаваў свой першы майстар-клас «10 крокаў да экалагічнага жыцця», надрукаваў візіткі на экапаперы і стаў развіваць свой уласны брэнд экатрэнера. На сёння Мінск стаў 30-м горадам, дзе я выступаю, мяне пачула больш за 20 тысяч чалавек. Зараз збіраюся выдаць кнігу «Зялёны драйвер-2: жыццё за горадам», апошнія два гады рухаюся ў гэтым кірунку. Мая першая кніга — на 60% кампіляцыя з іншых крыніц. Аднак усе гэтыя рэчы перажыты мной. Большасць трэнераў не расказваюць пра тое, як яны жывуць, што ядуць, а проста даюць парады. (У гэты момант Раман дастае сетку, якая замяняе яму ў краме пластыкавы пакет — яна створана ўдзельнікамі праекта «Авоська дорыць жыццё», сплецена сляпымі людзьмі. — Аўт.). Я матывую іншых людзей і запускаю «зялёную» хвалю далей.

— Вам пашанцавала з жонкай: яна падтрымлівае вашы ідэі...

— З Любоўю мы пазнаёміліся на канферэнцыі па абыходжанні з батарэйкамі, якую яна арганізавала. Праз два месяцы я пераехаў у Санкт-Пецярбург. Мы пажаніліся, нашаму сыну Саву ўжо два гады. Агульнасць поглядаў вельмі дапамагае. Люба мудра падказвала мне, што не трэба заўзята завабліваць людзей у экалагічны лад жыцця, многіх гэта адпужвае. На самой справе не трэба зацыклівацца на «бія» і «арганіцы». Шчыра запытайце ў сябе — ці любіце вы сябе і сваіх дзяцей? Калі так, то вы свядома зробіце выбар у бок здаровага і экалагічнага ладу жыцця.

Грузіў заплечнік і праз восем прыпынкаў на метро вёз усё гэтае дабро ў парк, дзе стаялі кантэйнеры для розных відаў адходаў.

— Ваша вяселле таксама атрымалася экалагічным?

— Так, мы арганізавалі арганік-вяселле ў экастылі. Прыдумалі такую фішку: замест традыцыйнага букета ў нявесты быў пучок з пятрушкі і сельдэрэю, які мы пасля з'елі. Куды важней, што на вяселле мы не заказвалі лімузінаў і шыкоўных аўтамабіляў. Нявеста была ў арыгінальнай сукенцы — нічога лішняга. Праблему з падарункамі вырашыў «спіс жаданняў»: дзякуючы яму нам не дарылі непатрэбных рэчаў. Безалкагольнае вегетарыянскае вяселле на 100 чалавек абышлося нам у 500 долараў. Я не разумею, чаму

Пятрушка і сельдэрэй замест букета.

бяруць крэдыты на вяселле — па-мойму, гэта шаблон, людзі не разумеюць, чаго хочуць.

— А як ставяцца да вашай экалагічнасці сваякі?

— Сям'я ў нас вялікая — чацвёра дзяцей, я старэйшы. Бацька, на жаль, не застаў маю гісторыю станаўлення на шлях экалагічнасці. Ён вельмі шкадаваў, што я з'ехаў у горад, спадзяваўся, што я застануся ў пасёлку ў Сібіры і займуся сельскай гаспадаркай. Мама заўжды казала: ваша жыццё — ваш выбар. Яна прывыкла жыць сціпла, таму экалагічныя ідэі ёй блізкія. Адна сястра — кансультант па натуральных родах, другая сартуе смецце. Яны прыхільніцы здаровага харчавання. Малодшы брат Арцём некалькі гадоў назад быў актывістам руху «Смецця. Больш. Няма» і ўдзельнічаў у арганізацыі дабрачынных крам «Дзякуй». Я ўдзячны сваёй сям'і за тое, што яна паступова пераймае мае ідэі.

— Вы сочыце за экаследам свайго сына Савы?

— Вельмі важна разумна падыходзіць да экаследу дзіцяці. Мы, напрыклад, выкарыстоўвалі біярастваральныя падгузкі, пакуль яны былі недарагімі. Спрабавалі і шматразовыя тканевыя, якія можна праць. Самая лепшая практыка ў гэтым выпадку — высаджванне, калі з малых гадоў у патрэбны момант несяце на гаршчок. У Савы гэтага не атрымалася, і ў выніку мы карыстаемся звычайнымі падгузкамі: па 1-2 у дзень на сон і прагулку. У тканевых спаць не пакладзеш: яны прамакаюць праз пару гадзін. Абавязкова натуральнае харчаванне. Што датычыцца цацак, у Савы шмат драўляных, але ёсць і пластмасавыя — проста мы стараемся сачыць, каб яны былі якаснымі і не змяшчалі ў сабе бісфенолу А. У нашага сына шмат машынак, але мы стараемся мяняцца цацкамі альбо аддаваць іх задарма, тым самым запускаем кругаварот цацак. Паказваем мультфільмы: Сава любіць «Свінку Пэпу» і «Гару самацветаў», але глядзець іх не больш за гадзіну ў дзень. Стараемся займаць яго прагулкамі, чытаннем, маляваннем ды іншымі карыснымі рэчамі.

— Вы плануеце жыць за горадам?

— Гэта мара зарадзілася пасля экалофта. Тады я зразумеў, што горад — не лепшае месца для экалагічнага жыцця. Сваім сябрам раю па магчымасці на нейкі час з'ехаць у экапасялішча, кластар альбо проста ў вёску. Аднак калі вам падабаецца горад, заставайцеся ў ім і рабіце яго «зялёным». Жыць у мегаполісе экалагічна цалкам рэальна. Напрыклад, у Стакгольме і Хельсінкі шмат зеляніны, выконваюцца стандарты па выкідах, траціна насельніцтва ездзіць на веласіпедах. Я ведаю, што многія людзі не ўяўляюць свайго жыцця без сцен кватэры, на прыродзе ім некамфортна. Але асабіста мне не надта добра жыць у горадзе. Да таго ж гарады з колькасцю насельніцтва да 100 тысяч жыхароў яшчэ можна «азеляніць», але зрабіць мегаполіс абсалютна «зялёным», на мой погляд, нерэальна.

Я пабываў у 20 расійскіх экапасялішчах, але ніводнае з іх мне не спадабалася для жыцця з сям'ёй. Былі спробы стварыць уласнае экапасялішча, але яны не скончыліся паспяхова. Этнаграфічны парк-музей «Этнасвет» за 90 кіламетраў ад Масквы, дзе я сёння жыву, — гэта мая шостая спроба пакінуць горад. Праект неверагодна вар'яцкі. Яго задача — узнавіць усе культуры свету на 240 га зямлі. Тут жывуць і працуюць 400 чалавек. Чыстае паветра, прырода і разам з тым даброты цывілізацыі — музеі, кавярні. Функцыянуе дзіцячы садок, у наступным годзе пачне працаваць школа. Мы з сям'ёй прапісаліся ў гімалайскім доміку, што ў азіяцкай частцы парку.

ШТО Ў ЗАПЛЕЧНІКУ ЭКАТРЭНЕРА?

1) Сетка
2) Камплект адзення
3) Папяровыя пакеты
4) Кніга
5) Кантэйнер з ежай
6) Пахучыя палачкі і запалкі
7) Экавізітоўкі
8) Чай
9) Казінак
10) Дажджавік
11) Бутэлька з вадой



Столькі смецця збіраецца ў сям'і за тыдзень.

«Шчыра запытайце ў сябе — ці любіце вы сябе і сваіх дзяцей? Калі так, то вы свядома зробіце выбар у бок здаровага і экалагічнага ладу жыцця».

— Напэўна, у вас усё ж ёсць эказвычкі, якія вы парушаеце?

— У мяне няма жорсткіх рамак, бо я не ідэальны экачалавек: такім можна назваць жыхара тайгі, які харчуецца з уласнага ўчастка, альбо жыхара аўтаномнага экапасялішча. Часам я набываю пластыкавыя пакеты — здараецца, забываю ўзяць з сабой сетку. Але пасля выкарыстоўваю пакет шмат разоў альбо здаю ў перапрацоўку. Часам п'ю каву, што таксама не здорава. Я заўважыў, што калі мы нешта забараняем сабе, часцей за ўсё гэта ператвараецца ў гвалт, часам хочацца парушыць забарону. Насамрэч экалагічнасць — гэта перш за ўсё здаровы сэнс. А жыццё — непрадказальная прыгода. Менавіта таму трэба паспець палюбіць сябе і іншых як можна больш.

Кацярына РАДЗЮК.
Фота з архіва Рамана САБЛІНА.

■ Фотаздымак з гісторыяй

А ДЗЯЎЧЫНА ЖЫТА ЖАЛА...

Гэтыя здымкі даслала вучаніца 10 класа Каця Брыкава з аграгарадка Цяхцін Бялыніцкага раёна. Летась яна ўжо прымала ўдзел у конкурсе.

«Вось і зноў ездзілі ў Пільшычы да бабы Ганны і дзеда Пятра Бучманавых, — піша Каця. — У іх старэнькім сямейным альбоме знайшла вось гэтыя фотаздымкі. На першым — у сярэдзіне — яшчэ маленькая, толькі скончыла 4 клас, бабуля Аня. З аднаго боку — два яе браты. З другога — дзве старэйшыя сястрычкі. Па баках — суседскія хлопчык і дзяўчынка. У верхнім шэрагу першы злева — Галашэўскі Сяргей Антонавіч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Другі — бабулін тата Вакуеў Пімен Ягоравіч (таксама ваяваў, быў паранены). Трэці, вышэйшы за ўсіх — Станкевіч (як звалі, бабуля не ведае) з Магілёва. Падчас вайны ён быў у партызанах, камандзірам атрада. І вось у 1960 годзе гэты чалавек са студэнтамі з Магілёва прыйшоў у паход. У лесе яны

наведалі месцы, дзе быў партызанскі атрад.

22 сакавіка 1943 года вёску Пільшычы немцы спалілі. Людзі хаваліся ў лесе — партызаны паспелі іх папярэдзіць. Пра вайну бабулі расказала яе маці (бабуля нарадзілася пасля вайны ў 1949 годзе).

На другім фотаздымку — баба Аня і мая мама Света (13 гадоў) жнуць жыта. Гэта было ў 1985 годзе. Фатаграфаваў мамін брат Вова. Раней жалі вось так, сярпамі, уручную.

Я хаджу ў 10 клас. На канікулы заўсёды еду да бабы з дзедам. У іх доме ёсць піяніна, я крыху іграю. Па вечарах з бабуляй ляжым на цёплай печцы. Разам спяваем песні, слухаю яе аповеды».

Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.

■ Майстар-клас

ШЧАСЦЕ... З ПАПЕРЫ

З Ірынай Іоўлевай я пазнаёмілася на адным з майстар-класаў па арыгамі. Мяне вельмі ўразіла, як гэтая захопленая сваёй справай жанчына змагла захапіць фігуркамі з паперы не толькі маці і іх дзетак, але і бабуль, і нават дарослых хлопцаў. Адных вучыла рабіць малпачак, другіх — вазачкі для кветак, трэціх — пярсцёнкі для сваіх каханых (дарэчы, пагадзіцеся, арыгінальны падарунак на папяровае вяселле). Скарыстаўшыся магчымасцю, я папрасіла Ірыну правесці майстар-клас для «Сямейнай газеты».

На носе лета — сезон вяселляў. Таму вырашылі зрабіць вытанчаных матылькоў. У старажытнасці іх клалі на стол маладым, каб яны прынеслі новай сям'і шчасце. Можна таксама рознакаляровымі папяровымі матылькамі ўпрыгожыць дзіцячы пакой. Цудоўна, калі да гэтай справы вы падключыце ўсю сям'ю. Матылёк — адна з самых простых фігурак: яе могуць зрабіць сваімі рукамі нават маленькія дзеці.

Фота Надзеі БУЖАН.

Ірына па адукацыі тэхнолаг адзення, дызайнер. Да арыгамі ж прыйшла, калі выйшла замуж і нарадзіла дачку.

— Проста тады, як і любая маці, пачала задумвацца, чым заняць дзіця. Самы даступны матэрыял — папера, яна заўсёды пад рукой. Арыгамі бываюць розныя. Вось гэтая жабка *(паказвае)* надзімаецца, варона каркае, жураўлік махае крыламі. З папяровымі фігуркамі можна гуляць, іх можна падарыць, можна любавацца... Акрамя таго, заняткі арыгамі станоўча ўплываюць на развіццё дзяцей.

Даказана, што пры складанні папяровых фігурак гарманічна развіваюцца адразу два паўшар'і галаўнога мозга (як і падчас заняткаў музыкай), памяць, логіка, густ, творчае мысленне, прасторавае ўяўленне. У дзяцей удасканальваецца дробная маторыка рук, рухі пальцаў робяцца больш дакладнымі (гэта асабліва важна для вучняў пачатковых класаў, якія вучацца пісаць літары).

— Сёння я цалкам згодная з Васілём Сухамлінскім, які казаў: «Чым больш майстэрства ў дзіцячай руцэ, тым разумнейшае дзіця», — кажа Ірына. — Мая дачка скончыла школу з залатым медалём, сярэдні бал атэстата — 10. Акрамя таго, адразу 100 балаў узяла на алімпіядзе па рускай мове. Скончыла музычную школу. Паступіла ва ўніверсітэт на фундаментальную хімію. Цяпер з'яўляецца галоўным рэдактарам факультэцкай газеты. Арыгамі, лічу, дало вялікі штуршок. На прыкладзе сваёй дачкі, а таксама іншых дзяцей узросту 6-7 гадоў **(Ірына 12 гадоў працуе педагогам у мінскім цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Эўрыка» пры школе №138)** бачу, як развіццё рук уплывае на развіццё мозга.

У Японіі ёсць інстытут узроставай медыцыны пры Універсітэце Тахоку. Прафесар Кавасіма Рута даказаў, што заняткі арыгамі павялічваюць паток крыві, які праходзіць праз прэфрантальную зону галаўнога мозга, дапамагаючы яму лепш працаваць.

У японцаў ёсць такі лозунг — «радасць знаёмства з арыгамі — тройчы ў жыцці». Першы раз яны адкрываюць гэты від мастацтва ў дзяцінстве, другі раз — калі вучаць складаць папяровыя фігуркі сваіх дзяцей, і нарэшце, трэці раз — ужо ва ўзросце 60-70 гадоў. У Японіі ў многіх клубах для пажылых людзей працуюць гурткі арыгамі, бо гэта цудоўны сродак прафілактыкі хваробы Альцгеймера.

— А вось гэта кусудамы (модульны від арыгамі — калі цэлая фігура збіраецца з некалькіх дробных частак, кожная з якіх складваецца з паперы) — лячэбныя шары. У Японіі клапатлівыя сваякі падвешваюць іх над ложкам хворых, каб выгнаць злых духаў. Пры гэтым змяшчаюць у папяровыя адтуліны лячэбныя зёлкі, эфірны алей.

Калі раней для вырабу папяровых фігурак выкарыстоўваўся толькі квадратны ліст паперы, то, цяпер мастацтва арыгамі развілася настолькі, што падыдуць і шасцівугольнікі, і прамавугольнікі.

— Дзе б я ні знаходзілася, пастаянна штосьці складаю, — усміхаецца Ірына. — Калі сяджу ў кавярні ці рэстаране, у ход ідуць сурвэткі, фольга ад цукеркі. Дарэчы, арыгамі — цудоўны спосаб здзівіць свайго маладога чалавека ці дзяўчыну (раней самураі заваёўвалі ўвагу дам на сярэднявечных балях, складваючы фігуркі з паперы). Можна скласці сурвэтку ў выглядзе лілеі, а ўсярэдзіну паставіць кубачак гарбаты. Альбо зрабіць ружачку.

Ірына раіць займацца арыгамі ўсёй сям'ёй. Балазе, у інтэрнэце шмат разнастайных схем. Пры жаданні можна запісацца на майстар-клас. У Мінску такую магчымасць прадастаўляе, напрыклад, цэнтр японскай культуры і традыцый «Хагакурэ».

Надзея ДРЫЛА. *dryla@zviazda.by*

ЯК СКЛАСЦІ МАТЫЛЬКА?



1. Вазьміце квадратны ліст паперы, любога памеру *(карыстайцеся схемай на здымках; відэа можна паглядзець на сайце «Звязды»)*.

2. Складзіце яго па дзвюх дыяганалях.

3. Затым складзіце квадрат напалову, каб атрымаўся прамавугольнік.

4. Злучыце верхнія вуглы прамавугольніка так, каб зверху і знізу атрымаліся два трохвугольнікі.

5. Цяпер загінаем угору вугалкі аднаго з трохвугольнікаў.

6. Верхні вугалок другога трохвугольніка загінаем так, каб ён ледзь-ледзь выходзіў за край першага.

7. Згінаем папалам крыльцы. Вуаля! Матылёк гатовы.



РАЗДАРЫЦЬ 1000 ЖУРАЎЛІКАЎ

«Калі чалавек зробіць 1000 жураўлікаў (цуру — традыцыйны сімвал шчасця і даўгалецця) і раздарыць іх, яго жаданне споўніцца, — пасля гэтых слоў Ірына працягнула нам з фатографам па папяровай фігурцы. — Зрабіла спецыяльна для вас. Люблю сама дарыць і дзяцей гэтаму вучу».

У 50-я гады ўвесь свет абляцела гісторыя пра японскую дзяўчынку — Садако Сасакі. 6 жніўня 1945 года, падчас атамнай бамбардзіроўкі Хірасімы, яна знаходзілася дома, усяго за мілю ад эпіцэнтра выбуху. Дзяўчынка выжыла. Але праз 9 гадоў у яе праявіліся прыкметы прамянёвай хваробы. 21 лютага 1955 года яна трапіла ў шпіталь. Лепшы сябар прынёс ёй лісток залацістай паперы і склаў з яе жураўля. Пры гэтым нагадаў павер'е пра тое, што жаданне чалавека, які склаў тысячу папяровых цуру, споўніцца. Садако стала складаць птушак шчасця з любых кавалачкаў паперы, якія траплялі ў яе рукі. Але паспела зрабіць толькі 644 фігуркі. Пасля смерці дзяўчынкі яе сябры завяршылі працу. З таго часу папяровы жураўлік лічыцца адным з сімвалаў міру і сяброўства.

ХОЧАШ, КАБ ТВАЁ ДЗІЦЯ ЎПЭЎНЕНА СТАЯЛА НА НАГАХ, — НЕ ТРЫМАЙ ЯГО ЎВЕСЬ ЧАС ЗА РУКУ (ВІКТОРЫЯ ФРАЛОВА).

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

ГЛУША Адамовіча

І АЖЫЎШАЯ ПАМЯЦЬ ЗАГАВОРЫЦЬ...

«Звязда» працягвае цыкл публікацый у падтрымку стварэння музея Алеся Адамовіча «Вайна пад стрэхамі» ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна

Вось яшчэ адзін Дзень Перамогі адышоў у гісторыю. З ранку да ночы па радыё грымелі песні тых часоў, тэлебачанне круціла ваенныя фільмы. Усё, здаецца, было як заўсёды. Акрамя аднаго. Мне здалося (або і вы заўважылі?), што іх, сапраўдных герояў Вялікай Айчыннай, амаль не засталося. Хаця чаму здзіўляцца? Нават тым, каму на пачатак вайны было ўсяго 15 гадоў, цяпер 90. Яшчэ некалькі гадоў — і Дзень Перамогі мы будзем адзначаць без сведак тых падзей . Хто тады раскажа нам праўду пра вайну?

Нядаўна незнаёмы малады чалавек ашаламіў на вуліцы непрыстойным пытаннем. Можа, хацеў самасцвердзіцца або праходзіў тэст на смеласць. У той момант я якраз думала пра Дзень Перамогі без ветэранаў, пра Адамовіча, музея якога дагэтуль няма. І ад слоў выпадковага мінака стала вельмі прыкра. «А ці ведаеш ты, хто такі Адамовіч?» — проста хацелася хоць чымсьці зняць гэтую нахабную ўсмешку з маладога твару. Паглядзець на яго без маскі. Усмешка сапраўды знікла. «Беларускі пісьменнік», — не вельмі ўпэўнена сказаў ён. «А што ён напісаў?» Хлопец адразу ж звяў і безнадзейна паціснуў плячыма: не ведаю.

Нешта падказвае, што такі невук сярод нас ён не адзін. Добры матэрыял для тых, хто сёння робіць спробы перапісаць гісторыю і прыменшыць заслугі нашых дзядоў у той перамозе. Вунь у Італіі ўсур'ёз кажуць пра стварэнне музея фашызму. Хочацца верыць, не дзеля таго, каб прапагандаваць яго. Але, як змрочна жартуюць на гэты конт у сецеве: у свеце зноў павялічваецца попыт на карычневую чуму.

На жаль, чалавечая памяць кароткая. У гэтым няма нічога асаблівага. Чалавеку так лягчэй перажываць нясшчасці. На тое і існуюць такія месцы, як Хатынь. У Магілёўскай вобласці, на жаль, ёсць свая Хатынь — вёска Баркі ў Кіраўскім раёне, якую дашчэнту знішчылі ў 1942-м нелюдзі са свастыкай на адзенні. Яны забілі 1800 мірных жыхароў гэтай і суседніх вёсак. Сёння пра страшнае мінулае нагадвае створаны тут мемарыяльны комплекс «Памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці». А яшчэ — аповесць Алеся Адамовіча «Карнікі», трагічныя падзеі якой непасрэдна звязаныя з гэтай «акцыяй застрашвання». Чытаеш або глядзіш зняты па ёй фільм «Ідзі і глядзі» — і мароз па скуры.

Дзяніс разам са сваёй цудам выратаванай бабуляй.

Магіляўчанін Дзяніс Іваноў добра ведае гэтую аповесць. Яго бабуля Ніна Іванова (у дзявоцтве Калеева) — адна з тых нешматлікіх жыхароў, якім пашчасціла пазбегнуць страшнай долі. Ёй было ўсяго 12 гадоў, калі маці за некалькі хвілін да прыходу ў іх вёску немцаў разам з дзецьмі паспела схавацца ў лесе.

Ад пасёлка Глуша Бабруйскага раёна, дзе адбываліся падзеі, апісаныя яшчэ ў двух раманах Адамовіча — «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой», — да Баркоў не вельмі далёка. І тое, што немцы не кранулі, — сапраўды цуд. Бо пасёлак усю акупацыю дзёрзка супрацьстаяў «новай уладзе». А акупанты каралі і за меншае.

Беларусь называюць яшчэ і партызанкай. Бо перамога кавалася не толькі на перадавой, але і пад стрэхамі дамоў звычайных беларускіх сем'яў. Нашы бабулі, дзядулі, бацькі, маці неслі цяжкі крыж, гінулі сотнямі, адзінкамі выжывалі. Краіна перамагла таму, што баявы дух яе не быў зломлены менавіта тут, у тыле.

Музей Адамовіча — унікальны праект, падобнага якому пакуль што няма ў Беларусі. Бо немагчыма ўявіць сабе Алеся Адамовіча, найлепшага пісьменніка ў стылі нон-фікшн, без герояў яго твораў, якія гінулі не на перадавой, а пад роднымі стрэхамі. Гэта своеасаблівы помнік усім тым партызанам, падпольшчыкам, жанчынам, дзецям, усім тым, хто дагэтуль не вярнуўся з вайны. Ён праілюструе творы пісьменніка, зробіць іх выпуклымі і гэтым яшчэ мацнейшымі па сіле ўздзеяння. Хатынь, Баркі, Глуша-падпольшчыца — героі твораў ажывуць і загамоняць. Музей не абмяжуецца сценамі дома, астатняе раскажа пасёлак, бо ў раманах Адамовіча тут «страляе» кожны камень, кожнае дрэўца. Зямля заўсёды гарыць пад нагамі чужынцаў, якія прыйшлі яе захапіць. У вёсцы жывуць нашчадкі прататыпаў герояў раманаў. У іх хатніх альбомах яшчэ захаваліся фотаздымкі відавочцаў. Яны самі — частка гісторыі , да якой можна будзе дакрануцца.

Па гэтую вёску Адамовіч напісаў у сваёй трагічнай аповесці «Карнікі».

Сёлета пры Бабруйскім райвыканкаме запрацаваў разліковы рахунак для збору ахвяраванняў. Я асабіста ведаю людзей, якія ўнеслі грошы з зусім не вялікіх сваіх заробкаў. Не заставайцеся ўбаку. Бо гэты музей патрэбен нашым нашчадкам, тым, хто ніколі не ўбачыць жывых ветэранаў. У Італіі трацяць грошы на музей фашызму. А ў Магілёўскай вобласці грошы збіраюць на музей патрыятызму. Бо ведаюць яму цану.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама
р/р 3642129272326 у філіяле 703 ААТ АБ «Беларусбанк», код 706
г. Бабруйск, УНП 701226324.

Прызначэнне плацяжу «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча».

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Марына ЯЎСЕЙЧЫК:

АПОВЕД ПРА ЖАНЧЫНУ, ЯКАЯ СТРАЦІЛА ГАЛАВУ

Марына Яўсейчык — з тых (так і хочацца дадаць: нямногіх) беларускіх апавядальнікаў, хто любіць кароткую форму. Прынамсі, часта выкарыстоўвае, знаходзячы ў ёй свае перавагі і нагадваючы нам, што проза — родная сястра паэзіі. А да ўсяго, лішні раз даказваючы, калі мець на ўвазе «Аповед пра жанчыну, якая страціла галаву»: і праз маленькі аб'ём можна хораша, адметна і запамінальна паказаць вялікую драму жаночага лёсу.

Алесь БАДАК

І

СЯДЗІШ і енчыш ад галаўнога болю. Сядзіш і енчыш, што зноў зіма. Няма дзяцей. І муж твой жыў — пасля сканаў. Не засталося больш нікога, хто б змог табе дапамагчы. «Чаму так?» — спыталася ты ў галаўнога болю. «Бо з юнацтва ходзіш ты без галавы», — крыкнуў ёй галаўны боль. Ды так моцна крыкнуў, што ў яе вачах пачалі мільгацець каляровыя палоскі. Яна ўпала. Як падае дрэва, якое сцяла электрапіла. Яна ўпала хутка, падаўшы апошні голас: «Жыццё мне здрадзіла!» І яе галава сутыкнулася з падлогай. Галаўны боль прапаў. Ягоная місія скончылася. Ён мусіў толькі сказаць ёй, што яна не мае ўнутранага голасу. Ён хацеў папярэдзіць яе пра небяспеку звонку. А яна заенчыла. Проста і шчыра. Па-чалавечы. Яна схавалася за гэты галаўны боль, каб нагадаць сабе і іншым пра тое, што яна жанчына, якая не мае дзяцей і мужа.

Але ж яе галава балела з іншай прычыны. Яна адчувала, што на яе хтосьці палюе. Нават тады, калі яна сядзіць спінай да батарэі. У яе ёсць суперніца: больш уплывовая і шчаслівая жанчына. Яна не дурыць нікому галавы і не мае галаўнога болю. Здаецца, яна таксама не мае сваёй галавы, і адсутнасць гэтага карыснага інструмента вымагае ад яе пэўных высілкаў для арганізацыі самастойнага жыцця за кошт заможных мужчын. Такія дзве розныя жанчыны. І без дай прычыны суперніцамі пасталі. Бо яна была жонкай для свайго мужа, а тая, другая — яго палюбоўніцай. Дзве безгаловыя жанчыны. Розніца толькі ў тым, што тая перажыла свой галаўны боль, а яна ад яго памерла, бо надала яму надта многа ўвагі, зрабіўшы з яго сутнасць сваіх праблем. І безгаловая жанчына сутыкнулася сваёй галавой з падлогай.

ІІ

Бацькі забаранілі ёй піць. Яна доўга трымалася. З самага дзяцінства. Трымалася, каб не сарвацца і не сысці ў запой. Яна глядзела на свайго бацьку і хацела ўчыніць яму жаночы мардабой пустой бутэлькай. Тады яна была падлеткам. А калі выросла — проста пайшла з дому. Каб не чуць і не бачыць, як п'е бацька. Ён быў сінім алкаголікам. А яна — яго дачкою? Так, яна была ягонай дачкою.

Гэтая гісторыя магла б стаць сумнаю, аднак яна не піла. Не таму, што даволі нагледзелася на бацькоўскія пахмеллі і скандалы, а яна проста ведала, што не выберацца самастойна з усяго гэтага. Яна адчувала, нутром адчувала: на яе палюе бутэлька. А спіртное — гэта частка яе жыцця. І яна хавалася ад жыцця так часта, што ў адзін зручны момант ёй захацелася проста выпіць. Гарачага віна. Бо не было побач каханага мужчыны. Не было побач мужа. Глінтвейн каля батарэі, у пакоі з адным драўляным ложкам без пасцельнай бялізны. А навошта? І так добра. Пераночыла — і зноўку вольная ляцець да сваёй адзіноты, якая сядзела ў яе галаве.

Яна была проста безгаловай жанчынай, у якой з'явіўся галаўны боль як вынік прысутнасці бацькі-алкаголіка і адсутнасці каханага мужчыны. Гэты галаўны боль штодня еў кару яе галаўнога мозга. У выніку яна знайшла збавенне ад адзіноты. Яна ўзяла і стамілася! Уяўляеце? Вы бачылі жанчыну, якая ўзяла ды стамілася? Гэта значыць, што яна ўзяла ды напілася! Не ад таго, што ёй забаранялі. Для таго, каб адчуць, што справы яе дрэнь. Што добры глінтвейн для яе задарагі, што ў яе няма дзяцей. І мужа. Што на яе палюе хтосьці дужы. То была смерць. А далей...

Вы ўжо ведаеце. Яе галава сутыкнулася з падлогай. Жанчыне не абавязкова быць алкагалічкай, каб памерці ад злоўжывання спіртнымі напоямі. Ёй дастаткова толькі спрычыніцца да жыццёвага працэсу і страціць сваю жаночую жыццядайную сілу. Ёй дастаткова толькі пачаць зарабляць грошы фізічнай працай, намуляць на выкшталцоных пальцах інтэлігенткі мазалі, адчуць сваю мізэрнасць перад светам і — напіцца. Гэтага ўсяго дастаткова для жаночай смерці.

Прадчуваючы ўсё гэта, яна хацела нарадзіцца хлопчыкам. Тады б атрымаўся сапраўдны сіні алкаголік. Як яе бацька. Алкаголік без суіцыдальных схільнасцяў.

ІІІ

Засталося расказаць, чаму яна страціла мужа, любага сэрцу чалавека. Яна так прызвычаілася да яго, што каханне ператварылася ў дзікае жаданне проста быць з ім побач. Больш нічога яна не хацела. Нават дзяцей ад яго не хацела. Пра такое можна толькі сказаць, што яе сутнасць растварылася ў яго сутнасці і яна ўжо перастала быць самастойнай жанчынай. Цяпер яна стала прывабным манекенам. Без душы і сэрца. І пачала піць. Так, яна пачала піць яшчэ раней, чым расказала пра гэта ў папярэдняй частцы. Яна пачала піць яшчэ пры мужу. Пачала ад таго, што не знала, чым заняць сябе, калі яны былі на адлегласці: заўжды на памежжы ягонай інтэлектуальнай працы ды іхніх сямейных адносін. У яе тады ўжо не было галавы. Але галава была ў яго. Ён заўжды насіў яе з сабою. Безгаловым ён не быў ніколі. Яна адпомсціла яму за гэта. Яна забрала ягоную галаву сабе. І ён памёр. Яна засталася ў адзіноце. Без мужа і дзяцей. Ад гэтага ў яе пачаўся галаўны боль. З кожным днём боль рабіўся ўсё больш гаваркі і гаваркі. Ён прасіў жыць сваім розумам. Але ж што такое жанчына без каханага мужчыны? Яна страціла галаву. І аддала сваё жыццё смерці.

Калі яна падала на падлогу, то зразумела, што была занадта нізкага росту для свайго мужа.

Апошняе, што сказаў ёй галаўны боль, гэта тое, што смерць падбірае з падлогі толькі тых, хто не падрос за жыццё, хто проста стаміўся і ўсё... Хто пачаў піць глінтвейн ад галаўнога болю.

І толькі тады яна зразумела, што, калі б была высокай, то не ўпала б: вага і рост яе цела затрымалі б яе на вертыкалі. Аднак яна даведалася пра гэта занадта позна: калі яе галава дакранулася да падлогі — да яе смяротнага гарызонту.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 27.06.2016 г. в 15.30
по адресу: 220030, г. Минск, ул. Кирова, 18, 3-й этаж, пом. 104 (конференц-зал «Консул»)

Организатор – республиканское унитарное предприятие

«Президент-Отель»

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

ЛОТ 1. Помещения №№ 20,21,22, площадью 32,8 кв.м, на одиннадцатом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, водоснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 115 200 бел. рублей; размер задатка – 111 500 бел. рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

ЛОТ 2. Помещения №№ 23,24,25, площадью 34,5 кв.м, на одиннадцатом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, водоснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 173 000 бел. рублей; размер задатка – 117 300 бел. рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

ЛОТ 3. Помещения №№ 26,27,28, площадью 34,2 кв.м, на одиннадцатом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, водоснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 162 800 бел. рублей; размер задатка – 116 200 бел. рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

ЛОТ 4. Помещения №№ 29,30,31, площадью 34,4 кв.м, на одиннадцатом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, водоснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 169 600 бел. рублей; размер задатка – 116 900 бел. рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

ЛОТ 5. Помещение № 33, площадью 18,6 кв.м, на одиннадцатом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 632 400 бел. рублей; размер задатка – 63 200 бел. рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

ЛОТ 6. Помещение № 50, площадью 28,0 кв.м, на шестом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 952 000 бел. рублей; размер задатка – 95 200 бел. рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

Документы на участие в аукционе принимаются с 27.05.2016 г. по 24.06.2016 г. с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00, по адресу: г. Минск, ул. Кирова 18, к. 602. Документы, поданные после 16.00 24.06.2016 г., не рассматриваются.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, перечисляет задаток на р/с № 3012000011054 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 192287408, ОКПО 381798305000, государственное предприятие «Президент-Отель» и предоставляет копию платежного документа; подает заявление на участие в аукционе, заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Помимо указанных документов:

Физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность. **Индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации; **Юридическое лицо – резидент** – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; **нерезидент** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Порядок определения победителя аукциона: торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона, до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 20 000 000 рублей.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Телефоны для справок: (8-017) 229-70-39, (8-029) 117-56-22.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 28 июня 2016 года ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Продавец и его юридический адрес:
Открытое акционерное общество

«Жлобинская швейная фабрика»,

247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 17, тел./факс (02334) 3 17 97

№ лота	Наименование объекта (лота)	Краткая характеристика
1	**Двухэтажное изолированное нежилое помещение с инвентарным номером 320/D-29111**	Назначение: помещение неустановленного назначения площадью 578,5 кв.м
	Местонахождение:	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Петровского, 17-3
	Начальная цена продажи (с НДС)	1 368 000 000 белорусских рублей (с 1 июля 2016 г. 136 800 руб.)
	Задаток	130 000 000 белорусских рублей (с 1 июля 2016 г. 13 000 руб.)

Аукцион состоится 28 июня 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45, 2-й подъезд.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным организатором аукциона.

